Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 САКАВІКА 2022 г.
ПЯТНІЦА
№ 53 (29675)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЯК СЭКАНОМІЦЬ НА ЖЫВОЙ АГАРОДЖЫ 6

АГРАСЯДЗІБЫ: НА ШТО СКАРДЗЯЦЦА МЯСЦОВЫЯ ЖЫХАРЫ МС

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МІШУСЦІН, прэм'ер-міністр Расійскай Федэрацыі:

«З нуля гадзін па маскоўскім часе 18 сакавіка здымаюцца ўсе абмежаванні на перамяшчэнне грамадзян у рамках Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. Аб гэтым мы гаварылі з прэм'ер-міністрам Раманам Аляксандравічам Галоўчанкам у пачатку тыдня ў Маскве і ўзгаднілі з Прэзідэнтам гэта рашэнне. Свабода перамяшчэння людзей важная з пункту гледжання развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і гуманітарных кантактаў паміж нашымі брацкімі народамі. Сёння гэта асабліва актуальна ва ўмовах узмацнення абмежаванняў з боку недружалюбных краін. Перакананы, што ўмацаванне інтэграцыі ў Саюзнай дзяржаве стане найлепшым адказам на санкцыйны прэсінг супраць Расіі і Беларусі».

МЕЛОДЫЯ ПОСПЕХУ

Фота БелТА.

У навучэнкі першага класа наваполацкай дзіцячай школы мастацтваў Ірыны ГАЙРЫЯН музычная кар'ера ідзе на дзіва паспяхова. Маленькая піяністка ўжо асвойвае праграму за пяты клас. Яна ўдзельнічае і перамагае ў розных міжнародных конкурсах. А летась дзяўчынка стала лаўрэатам Міжнароднага гранд-конкурсу «Талент года».

КАРАТКА

- **Віртуальны музей Вялікай Айчыннай вайны створаць у Гродне.**
- Экскурсійны праект «Ізумруднае падарожжа» пройдзе ў мінскім батанічным садзе.
- **Работнікі БЧ добраўпарадкуюць памятныя мясціны на аб'ектах магістралі.**

ISSN 1990 — 763X

Спажывец

«Лічбавізаваліся» нават бабулі і дзеці

І гэта не толькі пакупкі ў інтэрнэце

Сёлета Сусветны дзень правоў спажыўцоў, які адзначалі на гэтым тыдні, праходзіў пад дэвізам «Справядлівыя лічбавыя фінансавыя паслугі». І невыпадкова: менавіта ў лічбавай, віртуальнай сферы правы спажыўца сёння асабліва ўразлівыя. Таму спажывецкія арганізацыі маюць намер праводзіць кампаніі і даследаванні для развіцця лічбавых фінансавых паслуг, якія будуць інклюзіўнымі, бяспечнымі, справядлівымі і якія будуць трымаць даныя карыстальнікаў пад аховай. Беларускае таварыства абароны спажыўцоў — не выключэнне. Сёлета аб'яднанне плануе падрыхтаваць пакет канкрэтных прапаноў па змяненні заканадаўства. Пра гэта, а таксама пра тэндэнцыі «лічбавага спажывання» расказала старшыня арганізацыі Ганна СУША.

Фота БелТА.

СТАР. 4

Вечная тэма

ШТО ПАТРЭБНА ДЛЯ ШЧАСЦЯ?

Шчасце — гэта, здавалася б, тое, дзеля чаго мы ўсе жывём. А чым яно з'яўляецца з пункту гледжання нейрафізіялогіі? Навошта прырода падарыла нам гэты механізм і ці можа шчасце быць бясконцым? Як атрымліваць гармоны задавальнення ад простых рэчаў у штодзённым жыцці? Адкуль бярэцца хранічна няшчасныя людзі? Як не трапіць у пастку хуткіх спосабаў атрымання станоўчых эмоцый? І чаму стрэс — нярэдка расплата за задавальненне? Разбіраліся ў гэтым разам з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГУРБАНІДЖАДАМ.

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ХОЧАМ, КАБ ТАМ БЫЎ МІР»

Адной з асноўных тэм інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі японскаму тэлеканалу была сітуацыя вакол Украіны

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю тэлеканалу TBS. Размову з беларускім лідарам правёў вядучы праграмы Hodo Tokushu («Спецыяльны рэпартаж») Шагеноры Канехіра. Сімвалічна, што размова Аляксандра Лукашэнкі і японскага журналіста прайшла ў Зялёнай зале Палаца Незалежнасці. Менавіта тут у 2015 годзе праходзілі перагаворы нармандскай чацвёркі і былі выпрацаваны Мінскія пагадненні.

Фота БелТА.

Гутарка кіраўніка дзяржавы з японскім журналістам працягвалася каля паўтары гадзіны. Значная частка інтэрв'ю была прысвечана сітуацыі ў рэгіёне, у прыватнасці падзеям ва Украіне, пытанням захавання бяспекі, магчымасцям мірнага ўрэгулявання канфлікту і ролі Беларусі ў гэтых працэсах. Асобна закраналася тэма атамнай энергетыкі, якая мае асаблівую актуальнасць для Японіі, якая перажыла аварыю на АЭС Фукусіма-1. Размова таксама ішла аб двухбаковых адносінах Беларусі з гэтай краінай. Акрамя таго, пытанні Прэзідэнту датычыліся яго думкі аб распадзе Савецкага Саюза, асабістых і прафесійных узаемаадносін Аляксандра Лукашэнкі з лідарамі Расіі і Украіны.

У інтэрв'ю Аляксандр Лукашэнка выказаўся аб сітуацыі ва Украіне, шляхах урэгулявання канфлікту і пазіцыі Беларусі па гэтым пытанні.

«У дадзенай сітуацыі ніводны беларускі салдат ва Украіне не ваюе. Нягледзячы на іх варожую пазіцыю, якую яны занялі ў дачыненні да Беларусі, падштурхоўваемыя Захадам (мы перагарнулі гэтую старонку), я патэлефанаваў Зяленскаму і прапанаваў неадкладна ўступіць у перагаворы з Расіяй. Літаральна на трэці або чацвёрты дзень гэтай вайны, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І ён прыняў гэту прапанову. Мы арганізавалі тут, у Беларусі, тры раўнды перагавораў. І цяпер гэтыя перагаворы ў рэжыме відэаканферэнцыі працягваюцца. Яны ідуць».

«Гэта значыць, мы не нападаем на Украіну, мы не бамбім Украіну. Мы — прыхільнікі перагавораў. Мы хочам, каб гэтыя перагаворы скончыліся вось у гэтай зале. Сімвалічна, што ў гэтай зале. Дагаворы ў Мінску былі падпісаны тады па Украіне», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Таму мы прыхільнікі перагавораў. Мы хочам, каб там быў мір. Калі там не будзе міру, то не будзе міру і ў Беларусі з цягам часу. Вось наша пазіцыя», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на пытанне аб магчымасці ўдзелу Беларусі ў дзеяннях адносна Украіны, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Калі толькі Украіна будзе працягваць эскалацыю адносна Беларусі, то мы адкажам. Што я маю на ўвазе: яны ў момант канфлікту 23—24 чысла (лютага. — **«Зв».**) планавалі нанясенне ўдару па тэрыторыі Беларусі. Я пра гэта казаў. З чатырох кропак. Мы гэта прадухілілі. Яны парушаюць нашу дзяржаўную граніцу лятальнымі апаратамі, верталёт і гэтак далей».

«Больш за тое, у апошні тыдзень яны ажыццявілі пуск дзвюх ракет. Як мінімум дзвюх ракет «Кропка-У» па тэрыторыі Беларусі. На шчасце, нам удалося іх збіць. Таму, калі яны будуць правакаваць нас пастаянна, мы вымушаны будзем адказваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Але я практычна перакананы, што нам не давядзецца ваяваць з Украінай. Захаду не ўдасца ўцягнуць нас у гэты канфлікт. У нас дастаткова розуму для таго, каб не ўцягнуцца ў гэты канфлікт, як нас сёння амерыканцы разам са сваімі партнёрамі штурхаюць да гэтага канфлікту», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Я перакананы, што ў найбліжэйшы час гэты канфлікт — аперацыя Расіі — скончыцца мірам», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Скажу вам упершыню галоўнае: Расія прапануе Украіне (Пуцін — Зяленскаму), я гэта абсалютна дакладна ведаю, абсалютна прымальны варыянт дагавора. І сёння яшчэ магчыма, каб Украіна з Расіяй дамовіліся і Зяленскі падпісаў з Пуціным гэты дагавор. Калі Зяленскі на гэта не пойдзе, то, паверце, яму давядзецца з цягам невялікага часу падпісаць акт аб капітуляцыі. Расія ў гэтай вайне не прайграе. У гэтым вы 100 % перакананыя таксама. Чым заканчваецца вайна ў выпадку перамогі аднаго з бакоў, Японія гэта ведае лепш, чым я», — рэзюмаваў беларускі лідар.

* * *

Пасля размовы з Прэзідэнтам Шагеноры Канехіра сустрэўся з беларускімі калегамі і падзяліўся сваімі ўражаннямі. Ён расказаў, што да інтэрв'ю з беларускім лідарам рыхтаваўся паўтара года. «Гэта была прамая размова, у нас адбыўся шчыры дыялог. Ён мяне задаволіў», — расказаў журналіст.

Дарэчы, гэты рэпарцёр у сваёй кар'еры браў інтэрв'ю ў першага Прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова, Прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына, Дзяржсакратара ЗША Коліна Паўэла, Прэзідэнта Рэспублікі Карэя Кім Дэ Чжуна, Прэзідэнта Афганістана Хаміда Карзая. Тэлеканал TBS з'яўляецца часткай медыя-холдынга Tokyo Broadcasting System Holdings. Тэлеканал працуе з 1995 года. У складзе TBS 10 замежных бюро: у Маскве, Нью-Ёрку, Вашынгтоне, Лос-Анджэлесе, Лондане, Парыжы Пекіне, Шанхаі, Сеуле і Бангкоку.

Валерыя СЦЯЦКО.

УЗОР САПРАЎДНАЙ МУЖНАСЦІ, СТОЙКАСЦІ, ВЕРНАСЦІ

Ваеннаслужачым і ветэранам унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Паважаныя таварышы!

Віншую вас з днём утварэння ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Сёння ўнутраныя войскі — гэта высокапрафесійная ваенная арганізацыя, якая, захоўваючы традыцыі і вопыт ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, Афганістана, здольная ў поўнай меры забяспечыць правапарадак у краіне, мірную працу і спакой грамадзян.

З'яўляючыся неад'емным элементам сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, нават ва ўмовах пастаянна пераменлівай аператыўнай абстаноўкі вы заўсёды даказвалі, што ўмееце эфектыўна вырашаць самыя складаныя службова-баявыя здачы. Пры гэтым нязменна праяўляеце ўзоры сапраўднай мужнасці, стойкасці, вернасці прысязе. Перакананы, так будзе і надалей.

Дзякую за адданасць краіне і народу!

Жадаю моцнага здароўя вам, вашым родным і блізкім, шчасця, дабра, дабрабыту і новых поспехаў у высакароднай справе служэння роднай Беларусі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

З нагоды

ДОБРАЯ СЛУЖБА, КАЛІ НАДЗЕЙНЫ ТЫЛ

209 сем'яў ваеннаслужачых унутраных войск атрымалі ключы ад кватэр

Сімвалічна, што гэтая важная падзея ў жыцці кожнага чалавека адбылася напярэдадні Дня ўнутраных войск, які адзначаецца сёння. Сярод навасёлаў — 19 шматдзетных сем'яў, а таксама шэсць сем'яў, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды.

Фота БелТА.

— Атрыманне свайго жылля — адна з найбольш важных падзей у жыцці чалавека, — адзначыў падчас урачыстага адкрыцця жылога дома **міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ**. — Любая задача выконваецца лёгка, калі супрацоўнік, ваеннаслужачы ўнутраных войск упэўнены ў тым, што ў хаце ў яго парадак, бяспека, сям'я жыве ў добрым камфартабельным жыллі. Унутраныя войскі выконваюць свае службовыя задачы па прызначэнні і заўсёды гатовы стаць на абарону нашай Радзімы. Мы не падвядзём. На нашай зямлі будзе мір і парадак, мірнае неба над галавой.

Падзякаваўшы Прэзідэнту, дзяржаве за падтрымку сем'яў ваеннаслужачых, а таксама павіншаваўшы апошніх са святам, кіраўнік міліцэйскага ведамства звярнуўся да навасёлаў: «Ваша служба нялёгкая, самая цяжкая, але ўсе ведаюць, што той ваеннаслужачы, які прайшоў школу ўнутраных войск, можа служыць у любым падраздзяленні. Гэта кузня кадраў для органаў унутраных спраў. Любы камандзір, кіраўнік аддае перавагу таму кандыдату на службу, які служыў ва ўнутраных войсках».

Як прызнаўся адзін з уладальнікаў свайго жылля маёр Вадзім ТАРАСЕНКА, які служыць на факультэце ўнутраных войскаў Ваеннай акадэміі, гэта для яго сям'і вельмі доўгачаканая падзея. «Цяпер можна атрымліваць асалоду ад жыцця, служыць Радзіме без асцярогі, што твой тыл непрыкрыты», — лічыць ваеннаслужачы.

Як заўважыў **намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі генерал-маёр міліцыі Мікалай КАРПЯНКОЎ**, наша прафесійнае свята мы сустракаем з добрымі вынікамі аператыўна-службовай дзейнасці. «Усе задачы за 2021 год паспяхова выкананыя, правакацый не дапушчана, аператыўная абстаноўка нармальная, грамадскі парадак забяспечаны, — паведаміў камандуючы. — Сваё прафесійнае свята мы адзначаем у працоўных буднях: заступаючы на патрульна-паставую службу, забяспечваючы грамадскі парадак, ахоўваючы калоніі, асабліва важныя дзяржаўныя аб'екты, спецыяльныя грузы, Беларускую атамную электрастанцыю, займаемся пытаннямі размініравання па ўсёй краіне. У гэты складаны перыяд у сувязі з правядзеннем ваеннай спецыяльнай аперацыі ва Украіне мы займаемся выкананнем і асаблівых задач: узмацняем ахову Дзяржаўнай граніцы на паўднёвым напрамку, праводзім комплекс спецыяльных мерапрыемстваў на аб'ектах чыгуначнага транспарту, каб не дапусціць экстрэмізму. Акрамя таго, як была пастаўлена задача кіраўніком дзяржавы, — не дапусціць на нашу тэрыторыю ніводнага баевіка, наёмніка, тэрарыста, мы праводзім і комплексныя вучэнні па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Унутраныя войскі баяздольныя, моцныя, з высокай матывацыяй. У нас усё ёсць, каб выканаць любую задачу па захаванні нашай нацыянальнай бяспекі».

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Літве з чэрвеня электраэнергія можа падаражэць на 50 працэнтаў, газ — на 200 працэнтаў

З чэрвеня 2022 года электраэнергія ў Літве можа падаражэць на 50 працэнтаў, газ для аціплення — на 200 працэнтаў. Аб гэтым заявіў старшыня Дзяржаўнай службы рэгулявання энергетыкі Літвы Рэнатас Поцюс, паведамляе Delfi.

«Калі глядзець на тэндэнцыі біржы, рост цэн на электраэнергію складзе не больш за 50 працэнтаў. Калі не будзе нейкіх законаў. Гэтыя рашэнні пакуль не канчатковыя», — сказаў Рэнатас Поцюс.

Ён адзначыў, што цэны на газ будуць залежаць ад біржавых цэн. Ужо сёння яны даволі высокія. Згодна з прагнозамі, газ, што выкарыстоўваецца для гатавання ежы, падаражэе на 100 працэнтаў, а для аціплення — на 200 працэнтаў.

У Кітаі заявілі, што ніколі не забудуць, як ЗША бамбілі іх пасольства ў Югаславіі

Народ Кітая ніколі не забудзе, хто бамбардзіраваў пасольства краіны ў Югаславіі, і ён не мае патрэбы ў лекцыях ад парушальнікаў міжнароднага права. Адпаведная заява апублікавана на сайце місіі КНР пры Еўрапейскім саюзе, перадае РІА «Навіны».

Такім чынам дыпламаты Кітая адказалі на крытыку НАТА ў адрас Пекіна па яго пазіцыі ў адносінах да сітуацыі ва Украіне.

Кітайская місія назвала НАТА «пяражыткам халоднай вайны і найбуйнейшым у свеце ваенным саюзам, які не адмаўляецца ад пашырэння сваёй геаграфіі і спектра аперацый». Кітайскі бок заклікае Паўночнаатлантычны альянс задумацца над тым, якую ролю ён адыграў у забеспячэнні міру і стабільнасці па ўсёй Зямлі.

Раней генеральны дырэктар «Раскосмаса» Дзмітрый Рагозін назваў прэзідэнта ЗША Джо Байдэна ваенным злачынцам, нагадаўшы аб яго закліку бамбіць Бялград у 1999 годзе.

Распатэнт атрымаў заяўку на рэгістрацыю брэнда «Дзядзька Ваня», падобнага на лагатып McDonald's

У Распатэнт была накіравана заяўка на рэгістрацыю таварнага знака «Дзядзька Ваня», які ўключае ў сябе малюнак літары «В», перароблены з брэнда сеткі рэстаранаў McDonald's, паведаміла ведамства.

Заяўка на рэгістрацыю брэнда для аказання паслуг класа міжнароднай класіфікацыі паступіла ў Распатэнт 12 сакавіка.

10 сакавіка спікер Дзярждумы Вячаслаў Валодзін падчас абмеркаванняў на пленарным пасяджэнні сыход з Расіі заходніх сеткавых кампаній заявіў, што на месцы рэстаранаў McDonald's, якія выкарыстоўваюць расійскую сыравіну, «ужо заўтра» павінна з'явіцца айчынная сетка. Спікер назваў гэтую ўмоўную сетку «У дзядзькі Вані», дадаўшы, што рабочыя месцы павінны быць захаваныя, а цэны — зніжаны.

Блізкая ўлада

Электрыфікацыя для шматдзетнай сям'і

Праблемы жыхароў Гомельшчыны старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО разгледзеў падчас прамой тэлефоннай лініі і прыёму грамадзян у Рэчыцы

Да кіраўніка рэгіёна з просьбай аб дапамозе звярнулася шматдзетная маці. Праблема — у немагчымасці падключэння іх дома да сетак камунікацый. Сям'я будавалася на ўласныя грошы і з дапамогай крэдыту.

— Мы мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У 2016 годзе атрымалі ў вёсцы Броннае ўчастак. Тады ж звярнуліся з пытаннем электрыфікацыі. Але да гэтага часу нічога не вырашана. Быў і калектыўны ліст, — расказала жыхарка Рэчыцы.

Даць тлумачэнні Іван Крупко папрасіў прадстаўнікоў раённай улады. Яны патлумачылі: участак выдзелены пад забудову з ушчыльненнем і на падключэнне да існуючых сетак камунікацыі была распрацавана схема ўчасткаў, заключылі дагавор на дэталёвы план сядзібнай забудовы, але сутыкнуліся з тым, што населены пункт не мае горадабудаўнічага пашпарта.

— Навошта выдавалі ўчасткі, калі няма камунікацый? — задаў пытанне Іван Крупко. — Спачатку трэба зрабіць сеткі, потым даваць участкі тым, хто мае ў гэтым патрэбу. На працягу года людзі павінны засяліцца. Каб усе камунікацыі былі падведзены. Навядзіце парадак!

Па словах старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гомельскага аблвыканкама Дзмітрыя Гайкевіча, з 3 сакавіка бягучага года працэдура атрымання дазвольнай дакументацыі спрасцілася, і гэта дапаможа паскорыць вырашэнне азначанай праблемы. Губернатар паставіў задачу адказным службам пакрокава распісаць і растлумачыць, як будзе вырашана пытанне забудоўшчыкаў.

— Прымем усе меры, каб сёлета вы змаглі падключыцца да ўсіх камунікацый, — запэўніў шматдзетную маці з Рэчыцы Іван Крупко.

Іншую праблему да старшыні аблвыканкама данесла прыватны прадпрымальнік з Гомеля. Жыхарка абласнога цэнтра пачала з таго, што «дарожнае пытанне» на цэнтральнай вуліцы — сацыяльна значнае.

Фота БелТА.

— Былі блакіраваны ўсе раней існуючыя бяспечныя пад'язныя шляхі для абслуговага транспарту да крамаў крокавай даступнасці. Мае інтарэсы і інтарэсы іншых уласнікаў не былі ўлічаны. Пакуль вялікія крамы растуць як грыбы, маленькія зачыняюцца адна за адной. Часта крамы крокавай даступнасці зачыняюцца менавіта з-за адсутнасці пад'язных шляхоў, што і адбылося з маёй крамай на вуліцы Савецкай. Пытанне актуальнае і для іншых невялікіх гандлёвых пунктаў, якія знаходзяцца побач, — расказала прадпрымальніца.

Гамяльчанка апісала сваё бачанне сітуацыі, якая склалася ў 2019 годзе: пасля будаўніцтва гандлёвага цэнтра каля прадпрыемства «Светлатэхніка» былі кардынальна перапланаваны і зменены пад'язныя шляхі да прыдарожнай зоны, перагледжаны палосы руху транспарту па вуліцы. Жанчына папрасіла разгледзець магчымасць вяртання ранейшага заезду на прыдарожную тэрыторыю або арганізаваць паварот налева, каб улічыць не толькі інтарэсы суседняга гіпермаркета, але і ўладальнікаў дробных гандлёвых пунктаў, а таксама кіроўцаў ды пешаходаў.

Разабрацца ў сутнасці праблемы Івану Крупко дапамог начальнік УДАІ УУС аблвыканкама Андрэй Гаркуша. У ведамстве згаданае пытанне неаднаразова разглядалі. Змяніць схему арганізацыі руху на гэтым участку нельга ў мэтах бяспекі, давёў кіраўнік ведамства. Раз'езд адпавядае ўсім існуючым стандартам. Андрэй Гаркуша падкрэсліў, што ўчастак дарогі няпросты, на ім дастаткова буйная развязка, вельмі інтэнсіўны рух не толькі транспарту, але і пешаходаў.

— Галоўнае пытанне — бяспека, — пагадзіўся кіраўнік рэгіёна.

Ён даручыў гарадскім уладам аддаць максімум увагі камфорту пешаходнай зоны для руху людзей са слабым зрокам і невідушчых людзей да прыпынку грамадскага транспарту.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 19 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

• старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Іванавіч КРУПКО. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ . Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Дзеля бяспекі

Ва ўзмоцненым рэжыме

Беларускія ваеннаслужачыя разам з пагранічнікамі задзейнічаны ў абароне Дзяржаўнай граніцы

Разам з тым яны працягваюць удасканальваць сваё баявое майстэрства. Для правядзення тактычных заняткаў па агнявой, тактычнай і спецыяльнай падрыхтоўцы задзейнічаны палігоны «Брэсцкі», «Гожскі», «Чэпелева», «Даманаўскі», «Абуз-Лясноўскі», «Ружанскі» і «Лосвіда».

Як паведамілі ў Міністэрстве абароны, з мэтай змены падраздзяленняў, якія выконваюць задачы на паўднёвых межах, часткаў сіл адбываецца перамяшчэнне камбінаваным спосабам ва ўстаноўленыя раёны. Злучэнні і воінскія часці Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны ва ўзмоцненым складзе выконваюць задачы па абароне Дзяржаўнай граніцы ў паветранай прасторы.

Як падкрэсліваюць у абаронным ведамстве, ніякіх мерапрыемстваў мабілізацыі ў нашай краіне не праводзіцца. Усе мерапрыемствы ажыццяўляюцца паводле плана. «Адмабілізавання злучэнняў і вайсковых часцей Узброеных Сіл не прадугледжваецца, распаўсюджаная асобнымі дэструктыўнымі каналамі інфармацыя з'яўляецца чарговым фэйкам», — акцэнтавалі ўвагу ў прэс-службе Мінабароны.

Вераніка КАНЮТА.

Навасселле

З БАСЕЙНАМ І ТРЭНАЖОРКАЙ

У жылым мікрараёне Альшанка ў Гродне ўрачыста адкрылі новы дзіцячы садок

Ён пабудаваны па тыпавым праекце на сродкі абласной інвестыцыйнай праграмы. На ўзвядзенне аб'екта было накіравана больш чым восем мільёнаў рублёў. Гэта ўжо пяты дзіцячы садок у гродзенскім мікрараёне.

Садок разлічаны на 230 месцаў. І, трэба сказаць, ён ужо ўкамплектаваны. Тут будзе дзейнічаць 12 груп для дзяцей ад двух да сямі гадоў.

У трохпавярховым будынку створаны ўсе ўмовы для камфортнага знаходжання маленькіх жыхароў мікрараёна. Тут размясціліся прасторныя і зручныя пакоі для гульняў, утульныя спальні. Ёсць гімнастычная, музычная, універсальная і трэнажорная залы. Усе яны маюць сучаснае абсталяванне і інвентар.

Фішка новага садка — басейн. Таксама ў дзяцей будзе магчымасць наведваць камп'ютарны пакой. Падчас урачыстага адкрыцця ўручаны сертыфікаты на набыццё абсталявання і спартыўнага інвентару.

За здароўем дзетак будуць сачыць медыцынскія работнікі, для якіх адведзены спецыяльны блок, дзе ёсць і кабінеты вузкіх спецыялістаў. Сучасна абсталяваны і харчовы блок, створаны зручныя ўмовы для работы бытавых службаў.

Не забылі і пра тэрыторыю. Тут размясціўся стадыён і 13 гульнявых пляцовак.

У планах — будаўніцтва яшчэ чатырох сучасных дзіцячых садкоў у вобласці — Ашмянах, Слоніме, Лідзе і Астраўцы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

XXIX Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш

НА ХВАЛЯХ РАКІ ЧАСУ

Якія сюрпрызы рыхтуе XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш

Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш стала адной са знакавых падзей у жыцці нашай краіны. Яна аб'ядноўвае ўсіх, хто чытае, піша і выдае. З 23 да 27 сакавіка наведвальнікаў традыцыйнай выставачнай пляцоўкі на праспекце Пераможцаў, 14 чакаюць на аўтограф-сесіях і майстар-класах, конкурсах і канцэртах, прэзентацыях кніжных навінак, нават тых, якія днямі выйшлі з друкарні. Пройдуць круглыя сталы, нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі», літаратурны стартап, сімпозіум «Пісьменнік і час». Ад станцыі метро «Няміга» стане курсіраваць бясплатны паэтычны аўтобус, дзе можна пачуць творы беларускіх аўтараў і сустрэцца з пісьменнікамі.

Нягледзячы на каранавірус і праблемы з лагістыкай, сёлета выстаўка абяцае быць большай за мінулагоднюю. Акрамя таго, што ўдзел пацвердзілі пастаянныя госці кніжных выставак, колькасць выдавецтваў, якія прэзентуюць сваю прадукцыю, значна павялічылася. І рэгістрацыя ўдзельнікаў яшчэ працягваецца. Расійскі бок прадстаўлены дзясяткамі выдавецтваў. У два разы большай будзе пляцоўка кітайскіх аўтараў і выдаўцоў, спецыяльна да мінскай выстаўкі выйшлі некаторыя новыя кнігі. Адкрыюцца стэнды Турцыі, Пакістана, Палесціны. Іранскія калегі, як заўсёды, рыхтуюць вялікую пляцоўку, дзе пазнаёмяць і з кнігамі, і з культурай сваёй краіны.

Як паведаміў падчас прэс-канферэнцыі старшыня Савета арганізатараў кніжных выставак і кірмашоў Дзмітрый Макараў, значна прырос Нацыянальны стэнд Беларусі — ён яшчэ ніколі не быў настолькі вялікі.

МАСТОК У МІНУЛАЕ

Натуральна, у Год гістарычнай памяці асаблівая ўвага ўдзяляецца таму, каб паказаць ролю кнігі ў вывучэнні, захаванні і папулярызацыі культурнай спадчыны беларускага народа. Таму цэнтральны стэнд носіць назву «Рака часу Бацькаўшчыны». І прэзентавацца будуць не толькі кніжныя навінкі, але і ўсе праекты, дзякуючы якім гістарычная інфармацыя збіралася, асэнсоўвалася і даносілася чытачам на працягу больш чым двух дзесяцігоддзяў. Пры афармленні стэнда выкарыстаны незвычайны прыём, які дазволіць даведацца, як выглядалі раней беларускія гарады, мястэчкі, вёскі. Размешчаныя на ім старадаўнія фатаграфіі пры дапамозе спецыяльнай праграмы можна перанесці ў наш час — дастаткова толькі спампаваць спецыяльны інтэрактыўны дадатак. Адзін з аўтараў гэтай ідэі, калекцыянер, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір Ліхадзедаў упэўнены, што такім чынам можна прыцягнуць увагу гасцей выстаўкі да гісторыі, да пошукаў каранёў і падарожжаў па родным краі.

На выстаўцы прэзентуюць і так званы вечны каляндар (пазначаныя на ім даты не размеркаваныя па днях тыдня, што дазволіць яго выкарыстоўваць не адзін год) са старажытнымі фатаграфіямі, якія можна «ажывіць», а таксама праект «Бацькаўшчына», які аб'яднаў дзясяткі кніг, звязаных з малавядомымі старонкамі нашага мінулага.

Выстаўка раскажа і пра гісторыю беларускага пісьменства, як раней ствараліся кнігі, з гасцямі будуць працаваць каліграфы — для сучасных пакаленняў, якія больш прызвычаіліся да клавіятуры, гэта стане добрай магчымасцю паспрабаваць сябе ў чыстапісанні. Будзе працаваць незвычайная фотазона з сімвалам Беларусі — зубрам, зробленым з дэталяў старажытных друкарскіх машын XVII — пачатку XX стагоддзяў, нават яго поўсць створана з друкарскага шрыфту.

Традыцыйна адкрыецца пляцоўка, на якой Міністэрства інфармацыі пакажа найлепшыя кнігі, выдадзеныя ў нашай краіне. Сёлета тут будзе прадстаўлена каля 5 тысяч выданняў.

СУСТРЭЧА З КЛАСІКАМІ І АДУКАЦЫЙНЫ КВАРТАЛ

Гэты год багаты на юбілеі беларускіх пісьменнікаў. Таму асобная пляцоўка, якая афармляецца выдавецтвам «Мастацкая літаратура» (дарэчы, таксама 50-гадовым юбілярам), будзе прэзентаваць новыя праекты, звязаныя з імёнамі нашых класікаў. Наведвальнікаў чакае багата сюрпрызаў. Да мерапрыемстваў актыўна далучыліся літаратурныя музеі, якія падрыхтавалі гульні і цікавыя аповеды, на выстаўцы пакажуць рарытэтныя рэчы: фотаздымкі, рукапісы, кнігі. Напрыклад, можна пагартаць факсімільнае выданне Янкі Купалы «Шляхам жыцця» — яно такое ж, якім яго пабачылі чытачы ў 1913 годзе. А яшчэ на кніжнай выстаўцы можна будзе сустрэцца з самімі класікамі — пабачыць на экранах Янку Купалу, Якуба Коласа, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Янку Брыля, пачуць іх галасы.

Стагоддзе адзначае Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь — для кніжнай выстаўкі яна падрыхтавала цікавыя экспазіцыі і прэзентацыі.

За мінулы год выдавецкая дзейнасць прырасла ў параўнанні з папярэднім ковідным перыядам. Выйшла больш за 9 тысяч кніг тыражом каля 22 мільёнаў. На кожнага жыхара краіны прыпадала па 2,3 кнігі.

55 працэнтаў з усіх выданняў — вучэбная і адукацыйная літаратура. Таму сёлета на кніжнай выстаўцы асаблівая ўвага менавіта юным чытачам. Будзе працаваць цэлы адукацыйны квартал, дзе акрамя знаёмства з аўтарамі кніг і падручнікаў хлопчыкі і дзяўчаткі, а таксама іх бацькі змогуць атрымаць багата карыснай інфармацыі (напрыклад, кансультацыі псіхолага, лагапеда, пройдуць прафарыентацыйныя сустрэчы).

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

«Лічбавізаваліся» нават бабулі і дзеці

ТРЭНІНГІ ДЛЯ ПАЖЫЛЫХ І НЕ ТОЛЬКІ

Паводле слоў спецыяліста, лічбавыя тэхналогіі кардынальна мяняюць звыклыя рынкі плацяжоў, узнікаюць прынцыпова новыя магчымасці. Чакаецца, што да 2024 года колькасць карыстальнікаў, якія аперыруюць безнаяўнымі разлікамі, па ўсім свеце перавысіць 3,6 мільярда чалавек. Гэтак жа, як у інтэрнэт-крамах спажыўцы набываюць нейкі тавар, яны з дапамогай лічбавізацыі атрымліваюць доступ да лічбавых паслуг банкаў. Па сутнасці, калі вы карыстаецеся інтэрнэт-банкінгам, — гэта ўжо лічбавая паслуга.

Аднак распаўсюджванне лічбавых фінансавых паслуг прывяло як да павышэння традыцыйных рызык для спажыўцоў, так і да з'яўлення новых. Акрамя таго, абвастрылася праблема доступу — уразлівыя групы насельніцтва (тыя, хто гэтага доступу не мае) займаюць яшчэ больш няўстойлівае становішча ў грамадстве, дзе ўсё больш выкарыстоўваюцца безнаяўныя грошы.

— Наша грамадскае аб'яднанне сёлета плануе правесці ацэнку даступнасці фінансавых паслуг для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама для асоб старэйшага ўзросту, — падкрэсліла Ганна Суша. — Акрамя таго, трэнінгі па фінансавай адукаванасці для ўразлівых груп насельніцтва пройдуць у некалькіх гарадах Беларусі.

КУПЛЯ Ў ПРЫВАТНІКА НА «КУФРЫ» — НА СВАЮ АДКАЗНАСЦЬ

Амаль усе мы сёння з'яўляемся пакупнікамі, а часта і прадаўцамі, у інтэрнэце. Гэтаму спрыяла пандэмія, ды і цяпер гэта папулярны спосаб набываць тавары. «А ў выніку за мінулы год больш за 60 % прэтэнзій спажывец прад'яўляў нашаму таварыству на тавары, якія былі набытыя ў інтэрнэце», — адзначыла Ганна Суша. У нашай краіне створана нарматыўна-прававая база, з дапамогай якой спажывец заўсёды можа абараніць свае правы. Аднак, як адзначыла эксперт, не на ўсе адносіны куплі-продажу гэтыя законы распаўсюджваюцца.

«Калі спажыўцы ў сацыяльных сетках, на «Куфры» ці іншых пляцоўках набываюць тавары адзін у аднаго — гэта значыць адна фізічная асоба набывае нейкі тавар у іншай, — то Законам аб абароне правоў спажыўцоў гэтыя адносіны не рэгулююцца, — растлумачыла спецыяліст. — У выпадку, калі на гэтых пляцоўках ажыццяўляе сваю дзейнасць індывідуальны прадпрымальнік, можна заявіць сваю прэтэнзію, замяніць няякасны тавар або вярнуць грошы».

Ганна Суша нагадала, што да нарматыўна-прававых актаў, з дапамогай якіх спажывец заўсёды можа абараніць свае правы, перш за ўсё адносяцца законы «Аб абароне правоў спажыўцоў», «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання», Указ «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт», а таксама шэраг правілаў і пастаноў.

Нягледзячы на існуючыя прававыя дакументы, пра свае правы абмяняць або вярнуць тавар спажывец часцей за ўсё даведваецца ў крамах і ўжо пасля таго, як купля здзейснена і з нейкай прычыны тавар не падышоў.

Для таго каб правільна і абачліва здзяйснялі пакупкі не толькі дарослыя, але і дзеці, са школьнікамі таксама вядзецца работа па інфармаванні. «З 2000 года ў нас ужо выйшлі 4 выданні навучальнага дапаможніка «Асновы спажывецкіх ведаў», дапушчаны Міністэрствам адукацыі для факультатыўных заняткаў у сярэдніх школах. Планавалі, што гэта будзе для 7—8 класаў, — распавяла Ганна Суша. — Калі адаптавалі дадзеныя навучальныя дапаможнікі, мы думалі, ды і настаўнікі казалі, што для вучняў гэтага ўзросту такое выданне не падыдзе, але жыццё ідзе, дзеці сталеюць, і мы зразумелі, што гэта цалкам нармальна, бо ў школьніка ў такім узросце ўжо ёсць свае асабістыя грошы».

ПАЙШОЎ НА ПРЭЗЕНТАЦЫЮ — ВЯРНУЎСЯ З КРЭДЫТАМ

Напэўна, кожнаму другому з нас калі-небудзь паспрабавалі прадаць «цуда-скараварку» на прэзентацыі за казачныя грошы. Я толькі смяяўся ад такіх прапаноў. А дарма. На вуду трапілася мая мама, якая купіла плед з «сакрэтнага суперматэрыялу». І нічога, што грошай яна не ўзяла, — ёй аформілі крэдыт проста на прэзентацыі.

Дык вось, цяпер абаронцы нашых спажывецкіх правоў прапануюць выключыць з практыкі заключэнне крэдытных дагавораў іншымі асобамі, якія не з'яўляюцца прадстаўнікамі банкаў. Лічыцца, што такая асоба не можа аданіць фінансавую сітуацыю спажыўца і таму — складаць крэдытны дагавор.

Як паясніла Ганна Суша, гаворка ідзе аб крэдытных дагаворах, якія заключаюцца на прэзентацыях. Прыкладаў, калі людзі купляюць там простыя тавары ў яркай упакоўцы за неймаверныя грошы, а потым не ведаюць, як расплаціцца з банкам, нямала. У таварыстве разлічваюць разам з Нацыянальным банкам і Міністэрствам антымана-польнага рэгулявання і гандлю на працягу паўгода падрыхтаваць законапраект, які дапаможа пазбягаць падобных выпадкаў у далейшым.

НЕ КУПЛЯЙЦЕ «КАТА Ў МЯШКУ», НЯХАЙ САБЕ І ТАННАГА

Старшыня таварыства абароны спажыўцоў канстатавала, што лічбавыя тэхналогіі кардынальна мяняюць звыклыя рынкі плацяжоў. У гэтай сувязі кіраўнік арганізацыі дала некалькі рэкамендацый, як бяспечна рабіць пакупкі ў інтэрнэце.

У першую чаргу яна заклікала не спакушацца нізкай цаной — якасць можа аказацца адпаведнай. Пры дастаўцы варта папрасіць кур'ера паказаць тавар, расказаць, як яго правільна выкарыстоўваць. Пакупніку павінны абавязкова выдаць дакумент, які пацвярджае факт куплі.

А наогул, пільнасць варта праяўляць яшчэ на стадыі выбару анлайн-пляцоўкі для шопінгу. Не лішнім будзе праверыць, колькі яна працуе на рынку, каб не трапіцца на вуду крам-аднадзёнак. Акрамя таго, неабходна ўлічваць, што праблемы з беларускімі інтэрнэт-крамамі вырашыць прасцей, чым з тымі, што знаходзяцца за мяжой.

КАЛІ РЭЧ ВЯРТАННЮ НЕ ПАДЛЯГАЕ

Адна з актуальных праблем — неабдуманыя пакупкі. «Нашы спажыўцы не зусім сур'ёзна падыходзяць да выбару тых падарункаў, якія маюць намер уручыць да нейкай знамянальнай даты, юбілею або да якога-небудзь свята, — сказала Ганна Суша. — Напрыклад, пасля 8 Сакавіка паўсталі пытанні з вяртаннем падарункаў, якія не падышлі атрымальніку з той ці іншай прычыны. Тыя, якія аднесены да складаных тэхнічных тавараў, абмену і вяртанню не падлягаюць, адпаведна крамы адмовілі ў вяртанні грошай або абмене на іншы тавар».

Эксперт раіць: перш чым аплаціць куплю, добра ўсё абдумайце і не паддавайцеся стыхійным парывам. «У перыяд пікаў павышэння цэн спажыўцы пачынаюць купляць складаную бытавую тэхніку. Так, набываюць два халадзільнікі, якія, магчыма, не спатрэбяцца і проста ўстарэюць (маральна і фізічна), — адзначыла суразмоўніца. — Калі спажывец потым вырашыць іх вярнуць без важкіх прычын, акажацца, што гэтыя халадзільнікі — складаны тэхнічны тавар, а значыць, абмену і вяртанню не падлягае».

Як адзначыла эксперт, сферы, у якіх у спажыўцоў узнікаюць праблемы, абсалютна розныя — ад прадуктаў харчавання, адзення, абутку да долевага будаўніцтва.

«Прадукты харчавання ўваходзяць у пералік тавараў, якія абмяняць і вярнуць нельга, калі гэта дабраякасны тавар, але калі прадукт харчавання з недахопам, то такі тавар абавязкова вяртаецца. Аднак да нас з такімі выпадкамі звяртаюцца нячаста, дзесьці 1—2 % ад агульнай колькасці зваротаў».

КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

«Некалькі гадоў таму выклікалі здзіўленне факты куплі ў лічбавым асяроддзі, у інтэрнэт-крамах, і мы распрацавалі памятку, у якой дадзены парады, дзе і якім чынам набываць тавары, што праверыць перад купляй, на што звярнуць увагу, — расказала Ганна Суша. — Калі расшырэнне «.by» або «.ru», то такога прадаўца знайсці прасцей, чым калі расшырэнне «.com».

Ёсць у нас дастаткова добрая расійская інтэрнэт-крама, яна працуе на тэрыторыі Беларусі, прымае заявы ад спажыўцоў і іх разглядае. Спажывец прад'яўляе ўсе чэкі, якія пацвярджаюць панесеныя выдаткі на правядзенне экспертызы, іншыя выдаткі, і прадавец на інтэрнэт-пляцоўцы вяртае грошы за няякасны тавар і за праведзеную экспертызу. Такія экспертызы праводзім і мы — Беларускае таварыства абароны спажыўцоў».

Што рабіць, калі праблем пазбегнуць усё ж такі не атрымалася? Ганна Суша рэкамендуе звярнуцца найперш да прадаўца. Прычым з пісьмовай прэтэнзіяй. Не трэба тэлефанаваць, пісаць у месенджары, адпраўляць патрабаванні па электроннай пошце. На пісьмовую прэтэнзію прадавец абавязаны адказаць у 14-дзённы тэрмін. Калі рэакцыі няма, то спажывец можа звярнуцца з іскавым патрабаваннем у суд — сам ці праз таварыства абароны правоў спажыўцоў. Яго спецыялісты рыхтуюць іск, накіроўваюць яго ў суд і аказваюць падтрымку на працэсе.

Дарэчы, летась у Беларускае таварыства абароны спажыўцоў паступіла каля 14 тысяч зваротаў, з дапамогай грамадскага аб'яднання ў суды было накіравана 211 іскаў, амаль усе яны задаволеныя.

Сяргей КУРКАЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Организатор аукциона – ООО «Реалконсалтинг»,
ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. г. Минск, 220015, РБ, тел./факс: + 375 (17) 256-61-35
Адрес проведения аукциона: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. Продавец – ЗАО «МТБанк»

Повторный открытый аукцион № 19/21 по продаже здания в г. Бобруйск и помещения в г. Минск

Дата аукциона	Последний день приема заявлений	№ лота	Предмет аукциона	Местонахождение	Начальная цена продажи лота, USD* с учетом НДС	Сумма задатка по лоту, руб.
05.04.22 в 11.00	31.03.22 до 17.00	1	Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-2631, общая площадь – 364,7 кв. м, назначение – здание многофункциональное, наименование – здание многофункциональное, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000006000791 площадью 0,0394 га. Административное здание	Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 36	**79 000**	9 000,00
05.04.22 в 11.00	31.03.22 до 17.00	2	Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-70774007, общая площадь – 181,9 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение. ТЦ «Глобо»	г. Минск, ул. Уманская, д. 54, пом. 106	**169 200**	12 000,00

Повторный открытый аукцион № 01/22 по продаже административного помещения в г. Бобруйск

05.04.22 в 12.00	31.03.22 до 17.00	1	Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-6817, площадь – 48,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение с пристройкой. Административное помещение	Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Советская, 69-5	**14 000**	3 000,00

** Расчеты за приобретаемое имущество производятся в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату заключения договора купли-продажи*

Порядок проведения и выбора победителя	Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия
Прием заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8
Задаток	Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты: - для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN 30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22; - для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22. Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068. Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении повторного аукциона №_ по лоту №_»
Затраты	Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения повторного аукциона № 19/21 и повторного аукциона №01/22 соответственно лоту. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона по лоту в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона. Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона. 3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

КОНТАКТЫ ОРГАНИЗАТОРА: + 375 (17) 256-61-35 • + 375 (25) 549-86-22 auction@expertiza.by. Более подробную информацию и фото по объекту возможно увидеть, посетив страницу **http://www.expertiza.by.** Извещение об аукционе № 19/21 было опубликовано в газете «Звязда» от 23.10.21. Извещение о повторном аукционе № 19/21 и аукционе № 01/22 было опубликовано в газете «Звязда» от 18.01.22

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества УП «Пинская СПМК-5» (УНП 200111234) объявляет о проведении **01.04.2022 г.** с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/03/imushhestvo-pinskaya-pmk.pdf

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375336705001, +375296569865, Виктор.

Продавец: УП «Пинская СПМК-5».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **31.03.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **18.03.22** по 17.00 **31.03.22** на bankrottorg.by.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде, по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 240,00 бел. руб; за публикацию в СМИ – 179,71 бел. руб., стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; возмещение за оценку по лоту № 1 – 815,98 бел. руб., по лоту № 3 – 1189,88 бел. руб., аукционный сбор 4 % от цены реализации имущества.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения электронных торгов.

ШТО ПАТРЭБНА ДЛЯ ШЧАСЦЯ?

fotostrana.ru

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Доктар Гумен, што такое шчасце?

— Мы заўсёды яго згадваем — кожная жанчына кажа, што мусіць быць шчаслівай, маці — што дачка заслугоўвае шчасця. Калі мы спытаем у людзей, што такое шчасце, усе адкажуць па-рознаму. Псіхолаг скажа, што калі няма стрэсу, ты шчаслівы, бізнесмен распавядзе, што калі будзе добры кантракт, ён будзе шчаслівым, менеджар — калі ёсць добрыя продажы. Насамрэч ніхто дасканала не можа расшыфраваць, што такое шчасце.

З пункту погляду нейрафізіялогіі, гэта пэўны механізм у галаўным мозгу. Такая яго частка сустракаецца нават у стужачных чарвякоў. Мы называем гэта лімбічнай сістэмай. Адна з яе функцый наступная. Паводле біялогіі і эвалюцыі, усе мы мусім выконваць пэўныя рэчы, і калі мы робім іх правільна, выпрацоўваюцца пэўныя гармоны, якія і выклікаюць пачуццё задавальнення, эйфарыі ды шчасця. Сэнс дадзенай сістэмы ў тым, каб у жыцці мы дасягнулі мэты, да якой нас накіроўваюць наша прырода і эвалюцыя. Калі мы ідзём па правільным шляху, тады адчуваем сябе задаволенымі і шчаслівымі.

Гармонаў, якія адказваюць за наш эмацыянальны стан, шмат, але тры з іх асноўныя: эндарфін, сератанін і дафамін. Эндарфін выклікае яркае, але кароткачасовае пачуццё шчасця. Сератанін — больш глабальнае і працяглае адчуванне задаволенасці: калі мы па жыцці нечага дасягнулі. А дафамін — гармон-узнагарода, выпрацоўваецца, калі мы даглядаем сябе — напрыклад, мыемся, робім масаж, таксама падчас сексу ці калі з'ядаем шакаладку.

Калі згаданых гармонаў мы не атрымліваем, гэта сігнал, што нешта робім не так. І ў нас можа ўзнікнуць адчуванне прыгнечанасці, дэпрэсіўнасць і нават уражанне непаўнацэннасці. Нам зноў патрэбныя гэтыя гармоны. І каб іх атрымаць, мы мусім выконваць пэўныя задачы.

Трэба сказаць, што гэтыя ж гармоны выпрацоўваюцца і ў той момант, калі мы пачынаем адчуваць нейкую небяспеку ці трапляем у надзвычайную сітуацыю. Яны адказваюць за выжыванне — эндарфін, напрыклад, добрае абязбольвальнае. Гэтыя гармоны дазваляюць захоўваць баланс нервовай сістэмы. Калі нашы продкі ўцякалі ад драпежнай жывёліны, у такі момант было важна хутка прымаць рашэнні і актыўна рухацца. Калі чалавек, катаючыся на лыжах, атрымлівае траўму, ён не заўсёды адразу адчувае боль: устае і працягвае, быццам бы нічога не здарылася. І толькі праз нейкі час прыходзіць боль. Гэтыя гармоны даюць нам час дабегчы ці дайсці да больш бяспечнага месца, каб мы выжылі. Калі ўздзеянне іх знікаецца, мы пачынаем адчуваць боль. Гэты механізм ад продкаў, якія не заўсёды жылі ў бяспечных месцах, і небяспека магла чакаць іх дзе заўгодна.

— Ці можна зрабіць так, каб гармоны задавальнення пастаянна выпрацоўваліся? Ці можам мы быць увесь час шчаслівымі?

— Гэта дастаткова строгая сістэма, яе «ўзламаць» цяжка. Гармоны мы атрымліваем, толькі калі выконваем пэўную важную біялагічную функцыю. Было праведзена такое даследаванне. Пацукам укаранялі ў цэнтр задавальнення ў галаўным мозгу электроды. Да іх была падключана адна педаль, і калі пацук на яе націскаў, атрымліваў задавальненне, другая ж адказвала за падачу ежы. Калі арганізм лёгка атрымлівае незаслужанае задавальненне, стымуляцыя для дасягнення мэты анулюецца. Пацукі загінулі ад голаду, бо ўвесь час націскалі толькі на педаль, які прыносіў задавальненне.

Калі чалавек будзе ўвесь час атрымліваць незаслужанае задавальненне, тыя мэты, якія прырода паставіла перад намі, анулююцца, такім чынам ён ператвараецца ў бескарысную істоту. Калі чалавек штучна стымулюе цэнтры задавальнення з дапамогай алкаголю ці наркотыкаў, ён аўтаматычна становіцца бескарысным для грамадства. Яны атрымалі «кнопку шчасця», якая кароткачасова прыносіць ім дафамін, і такія людзі страчваюць мэтанакіраванасць. Наўрад ці алкаголік скажа, што хоча пабудаваць дом ці дасягнуць нечага на рабоце.

— А ці ёсць нейкія «легальныя» спосабы атрымання гармонаў шчасця?

— Так, не абавязкова ісці ў бок алкаголю ці наркотыкаў. Гармон выпрацоўваецца і падчас небяспекі. Яна не абавязкова мусіць быць некантраляванай. Гэта могуць быць экстрэмальныя заняткі і віды спорту накшталт скачкоў з парашутам, катання на горным ровары ці проста прагляд фільма жахаў. Здавалася б, незразумела, які кайф атрымлівае чалавек, калі падвяргае сябе небяспецы. Насамрэч, у такія моманты арганізм таксама выпрацоўвае гармоны задавальнення, і чалавек адчувае сябе добра. Калі ён нейкі час не катаецца на горных лыжах ці не скача з парашутам, то адчувае сябе нешчаслівым, і зноў ідзе па гэтае задавальненне. Гэта штучныя метадыкі атрымання задавальнення.

— Што перашкаджае выпрацоўцы гармонаў шчасця?

— Часам недахоп гармонаў шчасця звязаны з неспрыяльным месцам жыхарства, бо, напрыклад, той жа сератанін выпрацоўваецца з дапамогай сонца. Для чалавека больш камфортна жыць там, дзе цёпла і шмат расліннасці, чым там, дзе холадна і вільготна. У некаторых краінах з высокім узроўнем жыцця, такіх як Швецыя, Нарвегія, Данія, дзе хранічна не хапае сонца, шмат людзей з дэпрэсіўным станам і большая колькасць суіцыдаў.

Часам недахоп шчасця і дэпрэсіўны стан звязаныя з недахопам вітаміну Д і кальцыю. Калі нам недастаткова вітамінаў, мала выпрацоўваецца і гармонаў. І чалавек адчувае сябе няшчасным, нягледзячы на тое, што ў яго, магчыма, высокі ўзровень жыцця.

Яшчэ адзін гармон — мелатанін. Ён антаганіст гармону стрэсу карцізолу, выпрацоўваецца ўвечары падчас сну. Мелатанін таксама неабходны, каб наша нервовая сістэма была ў гармоніі. Ён выпрацоўваецца толькі ў цемры. Таму калі ў вокны спальні свецяць вулічныя ліхтары ці ў пакоі гарыць святло, асабліва сіняе, нават нязначнае, як лямпачка ад тэлевізара ці пульта, змяншаецца выпрацоўка мелатаніну. Вучоныя даказалі, што цеснае адзенне і нажныя бялізна таксама змяншаюць яго выпрацоўку аж да 60 %. Калі гэта доўга працягваецца, можа прыводзіць да адчування няшчасця.

— Адкуль бяруцца хранічна нешчаслівыя людзі?

— Ёсць такое паняцце як сіндром хранічнай стомленасці. Гэтыя людзі пажыццёва адчуваюць сябе няшчаснымі і дэпрэсіўнымі. У іх раптам пагаршаецца памяць, працаздольнасць, чалавек становіцца асацыяльным, не хоча кантактаваць з навакольнымі, і калі гэта працягваецца больш за шэсць месяцаў, гэта хранічная стомленасць, сіндром, апісаны яшчэ ў 1989 годзе.

Важна сказаць, што чалавек з хранічнай стомленасцю — смачны кавалак для клінік, бо каб паставіць такі дыягназ, трэба спачатку выключыць усё астатняе. І гэта патрабуе доўгага і дарагога абследавання.

Такога чалавека нельга называць гультаём, гэта хвароба. На жаль, няма адзінага меркавання, чаму яна з'яўляецца, некаторыя звязваюць яе з генетыкай. Лячэння, на вялікі жаль, не існуе. Яна не пройдзе ні пры добрым сне, ні падчас адпачынку. Аднак яна як раптоўна з'яўляецца, гэтак жа можа раптоўна і знікнуць. Розныя клінікі прапануюць розныя методыкі лячэння, але ні адна з іх не дае 100-працэнтнага выніку.

— Адным са спосабаў атрымаць хуткае задавальненне, асабліва ў жанчын, з'яўляецца шопінг...

— У сучасным свеце часта выкарыстоўваюць якасці нашай лімбічнай сістэмы, у прыватнасці тое, што яна не можа адрозніць сапраўдныя мэты ад ілжывых. У прыватнасці, для таго каб мы набывалі больш тавараў, у тым ліку тое, што нам насамрэч не патрэбна. З дапамогай рэкламы нас завабліваюць: у «Інстаграме» мы бачым дзяўчыну ў прыгожым купальніку ці мужчыну з дарагім гадзіннікам. І іх радасныя твары паказваюць, што гэта рэч зробіць кожнага шчаслівым. Наш галаўны мозг ставіць сабе за мэту купіць такі гадзіннік, і калі мы яго набываем, адорвае нас гармонамі шчасця. Але, як правіла, гэта кароткатэрміновае адчуванне. І мы зноў пачынаем нечага прагнуць. Гэта пастка: пастаянна патрабуюцца новыя і новыя пакупкі. Так становяцца шапаголікамі.

— Як не трапіць у такую пастку?

— Навучыцца адрозніваць ілжывыя мэты ад таго, што нам сапраўды важна і неабходна. Тут шмат залежыць ад узроўню інтэлекту. Чым ён вышэйшы, тым лепш чалавек расстаўляе прыярытэты.

Гармоны шчасця выпрацоўваюцца, калі мы атрымліваем «лайкі» ў сацсетках — чым іх больш, тым больш гармону шчасця. Калі падлетак «завісае» ў сацсетках і атрымлівае «лайкі» за фотаздымкі замест таго, каб вучыцца, ён ідзе па лжывым шляху. Сапраўдныя мэты, для якіх чалавек створаны і якія мусіць дасягнуць, ён мяняе на падманныя, і мы не атрымаем выдатніка і вучонага, а ўбачым чарговага інстаблогера.

Яшчэ адзін спосаб атрымання кароткачасовага гармону шчасця — пераяданне, адна з праблем сучаснасці. Гэта лёгкі спосаб атрымання гармону шчасця, але ён прывядзе да пэўных праблем са здароўем.

— Вы расказалі пра механізм атрымання гармону задавальнення ад экстрыму і небяспечных сітуацый. Няўжо стрэс настолькі для нас бяскшодны?

— Калі арганізм кампенсуе сябе пасля няшчасцяў, стрэс патрэбны. Вось як гэта працуе. Уявім, што на нас напаў сабака. У нас выпрацоўваюцца гармоны стрэсу, у прыватнасці, адрэналін і норадрэналін. Нашы зрэнкі пашыраюцца, кроў становіцца гусцейшай, каб у выпадку крывацёку арганізм хутчэй яго спыніў. Кроў пачынае пераразмяркоўвацца да галаўнога мозга і мышцаў, мы пачынаем лепш думаць і хутчэй бегчы. А вось пасля таго, як мы пераадолелі гэту сітуацыю, у нас пачынаецца стан дэпрэсіі: арганізму трэба адпачыць, перазагрузіцца і набрацца сіл. Мы мусім пасядзець, арганізм адновіцца і вернецца ў рабочы стан.

Іншая справа, што ў наш час фактары стрэсу пастаянныя і яны не заканчваюцца. І чалавек нярэдка трапляе ў стан хранічнага стрэсу і дэпрэсіі. Тут два варыянты выйсця: псіхатэрапія, калі мы звяртаемся да спецыяліста, і ён з дапамогай спецыяльных тэхнік пачынае нас аднаўляць або медыкаментозны — з дапамогай антыдэпрэсантаў. Калі прэпараты вам прызначыў урач, не трэба баяцца іх прымаць. Гэта такая ж хвароба, як прастуда ці кашаль.

Ёсць яшчэ адзін выхад са стрэсу: атрымаць такую фізічную нагрузку, каб не адчуваць ні рук, ні ног. Напрыклад, пайсці на марафон, падчас якога няма ніякіх іншых думак, акрамя таго, як дажыць да фінішу. У такія моманты згарае лішняя глюкоза, якая выпрацавалася ў нашых мышцах, знішчаюцца гармоны стрэсу, і аўтаматычна стан нармалізуецца.

Ды не заўсёды гарадское жыццё дазваляе нам пазбаўляцца ад стрэсу. Мы ж атрымліваем яго пастаянна — калі кантактуем з начальствам, чытаем навіны ці глядзім тэлевізар. Пасля кожнага такога «сеанса», на жаль, мы не можам выйсці на вуліцу на прабежку. Таму аўтаматычна можам праваліцца ў такую яму, адкуль выбрацца будзе складана.

— Можна ўвечары пайсці ў спартыўную залу і нагрузіць сябе, каб не адчуваць ні рук, ні ног...

— Калі фізічна чалавек здольны гэта рабіць — цудоўна. Але гарадское жыццё дае такія хваробы як атлусценне, стэнакардыя, гіпертанія і іншыя, з якімі не заўсёды спартзала магчымая. І стрэс можа ўзнікаць у пажылым узросце. Сёння людзі могуць працаваць і ў 60, і ў 65, і ў 70 гадоў, і назапашваць гэты хранічны стрэс.

— Калі штодзень мы чытаем дрэнныя навіны, як не загнаць сябе ў стрэс?

— Ёсць такое выслоўе, якога я і сам прытрымліваюся: «Нельга заслаць увесь свет дываном, лепш абуць туфлі». Свет не можа быць такім, якім нам хацелася б яго бачыць, таму варта мяняць сваё стаўленне да гэтага. Калі трымацца такой філасофіі, жыццё становіцца прасцейшым.

Алена КРАВЕЦ.

Надвор'е

Сонечна і ні кроплі дажджу

Першая палова сакавіка аказалася выключна сухой. У цэлым, за 16 дзён месяца на большай частцы тэрыторыі краіны ападкаў выпала ўсяго ад 1 % да 20 % ад нормы гэтага перыяду. Больш за ўсё іх было на метэастанцыі Мазыр — 12 міліметраў (гэта ўсяго 57 % ад неабходных значэнняў). Пры гэтым на асобных метэастанцыях за мінулы перыяд сакавіка ападкаў не назіралася ўвогуле. Вінаватыя ва ўсім шырокія антыцыклоны, якія перакрываюць шлях вільготным атлантычным вятрам. А ападкаў чакаць не варта яшчэ як мінімум да сярэдзіны наступнага тыдня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Таксама не будзе ні кроплі дажджу і ў пятніцу, 18 сакавіка. Па поўначы і паўночным усходзе краіны месцамі на дарогах магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ў дзённы час чакаецца ад 1 да 7 цяпла.

Выключна сонечна і без дажджу чакаецца ў гэтую суботу. Уначы і раніцай у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах краіны месцамі на дарогах магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 2—8 градусаў, па паўночным усходзе месцамі да 11 марозу. Удзень — ад плюс 4 да 11 градусаў цяпла.

Без ападкаў будзе і ў нядзелю. Уначы і раніцай у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах Беларусі на дарогах месцамі чакаецца галалёдзіца. Тэмпература ўначы будзе мінус 2—7 градусаў, удзень — ад 6 да 13 градусаў вышэй за нуль.

А на наступным тыдні чакаецца да плюс 15 градусаў

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня таксама прагназуецца надвор'е без ападкаў. У панядзелак уначы і раніцай галалёдзіца будзе месцамі на дарогах у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах краіны. Уначы тэмпература паветра складзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла, а ў дзённы час будзе дасягаць 8—15 градусаў вышэй за нуль.

Сітуацыя з ападкамі не зменіцца ажно да серады. У гэтыя дні (аўторак і серада) будзе таксама суха. Уначы і раніцай у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах месцамі на дарогах чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 градусаў з плюсам. Удзень тэмпература паветра складзе 9—15 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

«Не варта гнацца за экзотыкай»

Сакрэты прыгожай жывой агароджы

«Сын пачаў часта хварэць, — распавядае Вольга Ц. — Таму летась мы прадалі кватэру ў Мінску і за выручаныя грошы пабудавалі дамок у вёсцы. Першы год займаліся ўнутраным адстройваннем, плот не ставілі. Думалі пазней пасадзіць жывую агароджу. Але на наш участак пачалі хадзіць суседскія куры, сабакі. А пасля таго як засеялі газон канюшынай, яшчэ і конь панадзіўся. У выніку ўвесь участак у ямках ад яго капытоў. Таму сёлета плануем перш-наперш адгарадзіцца ад суседскай жыўнасці. Зробім гэта з дапамогай рабіцы, якую з часам хацелася б усё ж прыкрыць жывой агароджай. Думалі пасадзіць па перыметры ўчастка туі, але калі сказала пра гэта знаёмай, тая пачала адгаворваць: маўляў, ужо не модна. Цікава было б на старонках газеты пачытаць меркаванне спецыяліста пра гэта, а таксама даведацца плюсы і мінусы розных варыянтаў жывой агароджы».

Як сэканоміць на жывой агароджы? Якія расліны падыходзяць для такіх мэт найбольш? Пра гэта і не толькі пагутарылі з навуковым супрацоўнікам Цэнтральнага батанічнага сада Настассяй ГУЛІС.

Фота Настассі ГУЛІС.

Так выглядае фармаваная біручына, калі стрыгчы яе раз на год.

ЦІ ЗАГАНЯЦЬ УЧАСТАК У «ТУЕВУЮ КАРОБКУ»?

— Настасся, раскажыце пра плюсы і мінусы жывой агароджы.

— Насамрэч, плюсоў больш, чым мінусаў. Па-першае, калі жывая агароджа свабодна расце (не стрыжэцца), мы ствараем дадатковыя месцы для гнездавання. Акрамя таго, што зблізку можна паказаць малінаўку ды сініцу сваім дзеткам, дробныя птушкі — цудоўныя санітары саду. Яны паядаюць шкодных насякомых, у тым ліку і тлю. Па-другое, у адрозненне ад штучнай жывая агароджа гэтак не награваецца на сонцы. Ліставыя пароды добра затрымліваюць пыл, такім чынам ачышчаючы паветра вакол вашага дома.

Што датычыцца мінусаў, то, як усё жывое, жывая агароджа патрабуе больш догляду, чым агароджа з прафнасцілу. Але і ў гэтым таксама ёсць свае плюсы: ты хоць бы варушышся, нешта робіш.

Калі ўчастак невялікі, асартымент раслін, якія можна выкарыстоўваць для жывых агароджаў, вельмі абмежаваны. І іх пажадана стрыгчы, каб не займалі шмат месца. Альбо разглядаць у якасці варыянта вертыкальнае азеляненне. Пры дапамозе ліян можна цудоўна схаваць рабіцу.

— Напэўна, яшчэ адзін мінус — што трэба чакаць, пакуль жывая агароджа вырасце.

— Ну, не так гэта і доўга. Калі вы купілі добрыя саджанцы і правільна пасадзілі, за 3-4 гады агароджа набудзе завершаны выгляд. Лепш садзіць кусты восенню. Яны добра ўкараняюцца за зіму і нават у першы год дадуць значны прырост. Акрамя таго, восенню вы можаце набыць лепшыя па якасці саджанцы.

Любы мінус пры жаданні можна ператварыць у плюс. Ёсць сэнс жыць даўжэй, каб убачыць сваю агароджу ва ўсёй красе.

— Адносна папулярных вечназялёных агароджаў думкі разыходзяцца. Раскажыце пра недахопы туй.

— Туі адносна хутка растуць і выдатна глядзяцца ў групавых пасадках. Але раю добра падумаць, перш чым заганяць увесь участак у «туевую каробку», асабліва калі ён невялікі. Гэта глядзіцца сумнавата і падкрэслівае невялікія памеры. Хоць ёсць людзі, якім такое падабаецца.

Калі рабіць агароджу з туй-шасцігодак — гэта ўляціць у капеечку. Таму, каб сэканоміць, многія купляюць саджанцы вышынёй 30-40 сантыметраў. Але маленькі пасадачны матэрыял — гэта вялікая верагоднасць таго, што ён загіне да таго, як вырасце, бо коцікаў-сабачак ніхто не адмяняў. А хвойныя расліны вельмі адчувальныя да адходаў жывёл. Калі галінка туі адсохла, то яна адсохла назусім. У выніку будзе прагаліна.

Дапусцім, вы пасадзілі жывую агароджу з туек-шасцігодак. Праз чатыры гады прыйшлося капаць траншэю, каб правесці на ўчастак газ. У выніку пашкодзілі карані, нейкая расліна загінула. Вы ўжо не пасадзіце 10-гадовае дрэва, бо яно не перанясе перасадку. У найлепшым выпадку прыйдзецца садзіць шасцігодку, і агароджа будзе са шчарбінай.

Акрамя таго, у цяньку туі растуць павольней, чым на сонечных участках. Першыя два гады вы не будзеце бачыць розніцу. Але з часам з'явіцца хібы. У тых месцах, дзе не хапае сятла, туі будуць менш густыя. Вось і атрымліваецца, што вырасціць ідэальную вечназялёную агароджу няпроста.

«САМЫ ХУТКІ ВАРЫЯНТ — ПУЗЫРАПЛОДНІК І ДЗЁРАН»

— Парайце танны і непатрабавальны варыянт жывой агароджы.

— Ёсць два варыянты зменшыць догляд і колькасць пасадачнага матэрыялу, неабходнага для агароджы. Першы: мы садзім кусты, якія не патрабуюць стрыжкі.

Настасся ГУЛІС.

Напрыклад, глог, дзёран або дэкаратыўныя — язмін, вейгелу, спірэю, бэз венгерскі. Праўда, у агароджы, якая свабодна расце, ёсць адзін недахоп — яна займае больш месца.

Калі ж агароджу стрыгчы, трэба больш пасадачнага матэрыялу, бо гушчыня пасадкі не 1-2 кусты на метр пагонны, а 3-4. Для стрыжаных агароджаў часцей выкарыстоўваюцца біручына, кізільнік, якія добра растуць у зацямненні і маюць дробнае лісце. Дапусцім, у вас участак 100 метраў па перыметры, памнажаеце на тры — атрымліваецца страшная лічба. Але і тут можна добра сэканоміць. Вы садзіце агароджу ўздоўж адной часткі плота. На наступны год пры абрэзцы частку галінак можна выкарыстоўваць як чаранкі. Наразаеце палачкі даўжынёй 10-15 сантыметраў і ранняй вясной утыкаеце іх у зямлю. Так можна чаранкаваць дзёран, біручыну, кізільнік бліскучы, пузыраплоднік. Укаранілі, і праз год у вас ужо ёсць гатовы пасадачны матэрыял.

Найбольш танны варыянт — саджанцы, выкапаныя з грунту. Большасць парод, якія выкарыстоўваюцца для агароджаў, можна знайсці ў мясцовых лясных гадавальніках. Там яны каштуюць нашмат танней, чым у садовых цэнтрах. Падразаем карэньчыкі, пакідаем літаральна 20-25 сантыметраў. Надземную частку ўкарочваем сантыметраў да 30. Тым самым правакуем разгалінаванне. На наступны год, калі плануем вырошчваць стрыжаную агароджу, пачынаем стрыгчы. Практычна не чапаем верхнюю частку раслін, фарміруем сценкі агароджы. Многія людзі, самі таго не разумеючы, робяць горш. Вы, напэўна, бачылі агароджы з прагалінамі ўнізе. Гэта з-за няправільнага профілю стрыжкі. Калі збоку глядзім на агароджу, яна павінна быць як дах дома, сценкі не павінны адхіляцца ўверх, каб верхнія галіны не зацянялі ніжнія. Інакш рана ці позна ніжнія галіны адміраюць ад недахопу святла. Верхавіны пачынаем укарочваць, толькі калі агароджа дасягнула патрэбнай вышыні.

— А якая вышыня жывой агароджы самая аптымальная?

— 120 сантыметраў — вышэй цяжка трымаць кустарэз. Але калі вы вялікага росту, то, магчыма, ваша агароджа будзе вышынёй нават 150 сантыметраў. Калі вам патрэбна вышыня 2 метры і больш, тады нават не пачынайце стрыгчы — няхай расце свабодна.

Стрыгчы агароджу патрэбна як мінімум раз у сезон. Лепш гэта рабіць у канцы мая — сярэдзіне чэрвеня. Тады вынік стрыжкі захоўваецца практычна ўсё лета. Калі мы хочам мець ідэальную агароджу, якая выглядала б як элемент архітэктуры, яе трэба стрыгчы часцей. Дарэчы, стрыжка жывой агароджы — выдатны спосаб пазбавіцца ад дрэннага настрою. Памахаеш гадзінку-другую нажніцамі — і прыходзіш дадому абноўлены, негатыву як і не было.

— А якая жывая агароджа самая хуткая?

— Пузыраплоднік і дзёран. Гэтыя кусты самыя непатрабавальныя. Нават на беднай глебе растуць дастаткова інтэнсіўна.

— Настасся, раскажыце пра вашы ўласныя агароджы, што вы пасадзілі і чаму?

— На адным участку ў Сеніцы ў мяне стаіць еўрасетка, якая засцерагае ад сабак, але абсалютна не засцерагае ад людскіх позіркаў. Для гэтага я з боку вуліцы і пасадзіла жывую агароджу з біручыны.

На другім участку ў мяне агароджа з граба. Гэта было жаданне мужа. Таму я яму адразу сказала: «Будзеш стрыгчы сам». Бо там не абысціся без кустарэза-выскарэза, а гэта цяжкаватая штука. З граба, глогу, бука, ліпы, елкі можна ствараць высокія агароджы — жывыя сцены вышынёй ад 3 метраў.

На бацькоўскім лецішчы — там вялізны ўчастак побач з лесам — уздоўж граніцы пасаджаны звычайныя елкі. А таксама ёсць агароджа з квітнеючых кустоў — упярэмешку вейгела, спірэя Вангута, фарзіцыя. Дарэчы, фарзіцыя — адзін з нямногіх кустоў, які нават пры рэгулярнай стрыжцы ўсё адно цвіце. Бо ў большасці выпадкаў, калі рэгулярна стрыгчы, кветак на агароджы мы не ўбачым.

«ВА ЎСІМ ЁСЦЬ «РАЗЫНАЧКА»

— Што вы думаеце пра дзявочы вінаград як варыянт агароджы?

— Гэта апошняе, што я пасадзіла б у сябе на ўчастку. Расліна вельмі агрэсіўная, хутка расце і дрэнна кантралюецца. Як толькі галінка падае на зямлю, яна адразу ж укараняецца і дае новыя парасткі. Ёсць больш прыстойныя варыянты. Мне, напрыклад, з ліян больш падабаюцца розныя віды бружмелю. Самы вядомы — Капрыфоль — на мой погляд, не самы ўдалы. Ён вельмі моцна апошнія гады ў нас хварэе, лісце пашкоджваецца павуцінным кляшчом і мучністай расой. У выніку расліна ў другой палове лета стаіць лысая. Ёсць больш устойлівыя віды бружмелю — Перакліменум, Браўна. Аднак бружмель лепш садзіць на паўасветленых, асветленых участках.

Для ценю можна выкарыстоўваць актынідыю. Ёсць два віды, якія выдатна сябе адчуваюць у Беларусі, — Каламікта і Аргута. У іх плады па смаку нагадваюць ківі. На мой погляд, самая прыгожая — актымідыя Каламікта. У яе ў момант цвіцення на лісцях з'яўляюцца серабрыста-белыя плямы. А пад канец цвіцення — ружовыя.

Таксама можна пасадзіць розныя віды клематісаў. Улетку яны прыгожа квітнеюць. Мінус у тым, што ўвосень лісце не ападае, а так і вісіць зімой скручанае і непрывабнае.

З таго, што ўецца, яшчэ рэкамендую лімоннік. Гэта цудоўная лекавая расліна з прыемным водарам. З яе ягад і лісточкаў можна рабіць танізавальныя напоі. Восенню лісце лімонніка вельмі прыгожа залацістага колеру. Я на ім ніколі не бачыла ніякіх шкоднікаў, хвароб.

Калі ўсё ж такі ваш варыянт — дзявочы вінаград, тады трэба, каб апора была трывалай, бо гэтая ліяна, асабліва пасля дажджу, вельмі масіўная.

— Некаторыя ў якасці жывой агароджы разглядаюць калючыя кусты, бо лічаць, што яны лепш засцерагаюць ад нежаданых гасцей.

— З калючых кустоў магу парэкамендаваць глог. Ён добра выглядае, стрыжэцца і не хварэе. Многія ранняй вясной купляюць у гадавальніках барбарыс звычайны. Расліна сімпатычная, але да восені лісце пакрываецца мучністай расой. А на другі год — яшчэ іржой. Калі шчыра, я не садзіла б барбарыс, нават калі б мне заплацілі за гэта. Барбарыс Тунберга хварэе менш, але ён па вышыні не падыходзіць для агароджаў.

— Вечназялёная агароджа прыгожая круглы год. Ліставыя ж кусты ўзімку стаяць лысымі...

— Калі агароджу рэгулярна стрыгчы, яна і зімой без лісця выглядае выдатна. У многіх кустоў ёсць асаблівасці ў афарбоўцы кары. Напрыклад, дзёран. У яго маладыя парасткі яркага малінава-чырвонага колеру. Ва ўсіх раслін ёсць нейкая «разыначка», якая нават зімой выглядае няблага.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас таксама ёсць пытанне, якое мы можам пераадрасаваць спецыялісту, пішыце. Мы з радасцю дапаможам знайсці на яго адказ.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ!

• Выбірайце толькі тыя расліны, якія будуць добра сябе адчуваць на вашай глебе. На вільготнай не варта садзіць пузыраплоднік, ён адчуває сябе выдатна на пясчанай. Калі ў вас пясок — не садзіце біручыну, яна адчувальная да глебы і вільгаці. Калі зямля пясчаная і беднаватая, то лепш браць кізільнік бліскучы. Ён наогул вельмі непатрабавальны: расце і ў цяні, і на сонцы, і на сырой зямлі, і на сухой.

• Заўсёды трэба правільна разлічваць колькасць кустоў на пагонны метр. Вядома, можна сэканоміць і пасадзіць саджанцы радзей, чым трэба. Але лепш садзіць меншы кавалак, але з правільнай частатой. Тады агароджа атрымае завершаны выгляд дастаткова хутка.

• У выпадку з жывой агароджай не варта гнацца за экзотыкай. Лепш браць штосьці праверанае. Не выбірайце стракатыя кусты, бо яны з цягам часу будуць напружваць. Агароджа — гэта фон, а ён павінен быць спакойны.

• Ніколі не эканомце пры пасадцы на правільнай рабоце. Некаторыя думаюць: «Капаць пасадачную траншэю цяжка і доўга, давайце я накалупаю маленькіх ямак і закапаю кусты». Так гэта не працуе. Калі няма сіл выкапаць 20 метраў пад рыдлёўку, вазьміце ў арэнду на дзень траншэекапальнік.

• Не трэба пры пасадцы жывой агароджы ўносіць ніякія ўгнаенні. Няхай расліна добра ўкараніцца. Потым, калі ўбачыце, што слаба расце, калі ласка, карміце. Калі ж у вас стрыжаная агароджа, падкормка — просты шлях да бясконцай стрыжкі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
18 сакавіка 2022 г. № 10 (646)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Наталля КАЧАНАВА:

«НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА НЯПРОСТЫЯ ЎМОВЫ, НІВОДНЫ ПРАЕКТ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ ДЗЯРЖАВЫ НЕ БЫЎ СПЫНЕНЫ»

У сталіцы адбылося ўрачыстае адкрыццё 16-й гарадской клінічнай паліклінікі, удзел у якім прыняла Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаная Прэзідэнта па горадзе Мінску.

Трэба сказаць, што работы па капітальным рамонце праводзіліся ў рэжыме нон-стоп, без спынення дзейнасці ўстановы аховы здароўя. У 16-й паліклініцы абслугоўваецца амаль 50 тысяч чалавек — жыхароў Цэнтральнага і Савецкага раёнаў Мінска.

Як паведамілі ва ўстанове аховы здароўя, планавая магутнасць паліклінікі — 850 наведванняў у змену, 80 % абслуговай тэрыторыі складае прыватны сектар, радыус — да 15 км (жылыя мікрараёны Навінкі, Зацень).

Неабходнасць у мадэрнізацыі наспела даўно: паліклініка была ўведзена ў эксплуатацыю яшчэ ў 1986 годзе. Зараз будаўнічыя работы на аб'екце завершаны цалкам. Разам з гэтым пераабсталявана клініка-дыягнастычная лабараторыя, аддзяленне функцыянальнай дыягностыкі, аддзяленне рэабілітацыі і фізіятэрапіі, пачынае дзейнічаць кабінет спелеатэрапіі.

З такой падзеяй у жыцці сталіцы яе жыхароў павіншавала Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. Яна звярнула ўвагу на тое, што ўмовы, створаныя ў паліклініцы, паўплываюць на аказанне якаснай медыцынскай дапамогі насельніцтву.

— У нашай краіне сістэме аховы здароўя ўдзяляецца самая сур'ёзная ўвага, — нагадала спікер верхняй палаты парламента. — Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка акцэнтуе ўвагу на тым, каб усе жыхары нашай краіны мелі магчымасць атрымліваць якасную медыцынскую дапамогу ў любым кутку нашай краіны.

Наталля Качанава падкрэсліла: ахова здароўя — прыярытэтны кірунак дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. У краіне будуюцца, мадэрнізуюцца, рэканструіруюцца ўстановы аховы здароўя, набываецца новае сучаснае абсталяванне, ідзе падрыхтоўка кваліфікаваных медыцынскіх кадраў.

— Толькі за 2021 год у нашай краіне ўведзена 27 новых аб'ектаў сістэмы аховы здароўя, — адзначыла спікер. — У горадзе Мінску таксама ёсць выразны план рэканструкцыі, мадэрнізацыі і будаўніцтва новых устаноў аховы здароўя.

Наталля Качанава нагадала аб нядаўнім адкрыцці новага корпуса 9-й клінічнай бальніцы. Акрамя таго, паводле яе слоў, з кіраўніцтвам горада ўжо абмяркоўваецца будаўніцтва новай інфекцыйнай бальніцы, у планах — будаўніцтва рэспубліканскага афтальмалагічнага цэнтра.

— Нягледзячы на няпростыя ўмовы, з якімі сутыкнулася наша краіна (кавід-інфекцыя і санкцыйны ціск), ніводная праграма, ніводны праект сацыяльнай палітыкі не былі спынены — усё дзейнічае, і, наадварот, мы сёння робім усё, каб наша краіна развівалася, прытым эфектыўна, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на тым, што ў аснове дзяржаўнай палітыкі краіны — чалавек і ўсе пытанні, звязаныя з яго жыццём.

стар. 8

ШАНЦ ДЛЯ СТВАРЭННЯ НОВЫХ КААПЕРАЦЫЙНЫХ ЛАНЦУЖКОЎ

СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ аб сітуацыі ў эканоміцы:

— Няпростыя часы патрабуюць няпростых рашэнняў. Дакладнасць гэтай славеснай формулы чарговы раз пацвярджаецца на практыцы, — адзначае сенатар і кажа пра цыклічнасць падзей. — Мы бачым, што сёння паўтараецца гісторыя двухгадовай даўніны. Тады, у 2020 годзе, мы аператыўна рыхтавалі і сцвярджалі пакет мер па стабілізацыі сітуацыі ў эканоміцы ў сувязі з эпідэміялагічным становішчам.

Паводле яе ацэнкі, прынятыя тады меры дазволілі захаваць працоўныя калектывы, унікальныя кампетэнцыі айчынных прадпрыемстваў, знешнія рынкі збыту.

— Мы не дапусцілі разбалансіроўкі банкаўскай сістэмы, валютнага рынку, пацвердзілі на міжкраінавым узроўні рэпутацыю надзейнага партнёра, які своечасова выконвае свае абавязацельствы, — нагадвае старшыня профільнай камісіі.

Яна адзначае, што цяпер улады краіны зноў вымушаны шукаць нетрывіяльныя рашэнні, арыентаваныя на ўмацаванне нацыянальнай эканомікі. Сенатар задаецца пытаннем: «У чым адрозненне гэтых двух перыядаў?»

— У 2020 годзе акцэнт быў зроблены на кропкавых мерах падтрымкі сектараў эканомікі, якія былі найбольш адчувальнымі да каранавірусных абмежаванняў, — згадвае Таццяна Рунец і параўноўвае з цяперашнім днём: — Сёння сітуацыя прынцыпова іншая. Фактар санкцый уплывае больш сістэмна і комплексна. Таму сектаральная падтрымка можа быць ужо не такой эфектыўнай і дастатковай.

Яна пераканана, што краіне патрэбна перш за ўсё мабілізацыйная эканамічная палітыка, у аснове якой традыцыйныя прыярытэты.

— Яны выразна сфармуляваны Кіраўніком дзяржавы ў Пасланні беларускаму народу і парламенту. Проста рэалізоўваць гэтыя прыярытэты трэба значна больш хутка і энергічна, укараняючы новыя інструменты падтрымкі і стымулявання, — упэўнена старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі.

Што гэта за прыярытэты? Паводле яе слоў, гаворка павінна ісці аб рацыянальным імпартазамяшчэнні, інвестыцыях, развіцці рэгіёнаў, эфектыўнай занятасці, росце несыравіннага экспарту. Усе гэтыя крокі, на думку сенатара, па-ранейшаму застаюцца ў актуальным эканамічным парадку.

— Акрамя таго, трэба больш актыўна задзейнічаць патэнцыял інтэграцыйных аб'яднанняў, такіх як саюзная дзяржава, ЕАЭС, СНД, — кажа Таццяна Рунец. — За гэтыя гады нашы краіны сур'ёзна прасунуліся ў фарміраванні адзіных правілаў гульні ў эканоміцы, паслядоўна скарачаецца колькасць выключэнняў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі.

Яна лічыць, што бягучую сітуацыю можна разглядаць як гістарычны шанц для стварэння новых кааперацыйных ланцужкоў на постсавецкай прасторы.

— Як вынік у сярэднетэрміновай перспектыве мы павінны сфарміраваць структуру эканомікі, менш уразлівую да знешніх фактараў. Гэта дазволіць выйсці на траекторыю ўстойлівага развіцця і эфектыўна вырашаць сацыяльныя задачы, — рэзюмавала сенатар.

У ТЭМУ

Віктар ЛІСКОВІЧ:

«У краіне выбудаваная дакладная сістэма арганізацыі якаснай і даступнай меддапамогі»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці аб даступнасці медыцынскай дапамогі ў рэгіёнах:

— Сёння ў краіне выбудавана дакладная сістэма арганізацыі якаснай і даступнай медыцынскай дапамогі кожнаму грамадзяніну, — перакананы старшыня профільнай камісіі.

Ён нагадвае: першасная медыцынская дапамога аказваецца ва ўрачэбных амбулаторыях і паліклініках па месцы жыхарства. Аказанне медыцынскай дапамогі арганізавана на базе фельчарска-акушэрскіх пунктаў, тэрытарыяльна замацаваных за паліклінікамі, амбулаторыямі, участковымі бальніцамі.

У асобных выпадках, калі матэрыяльна-тэхнічная база фельчарска-акушэрскіх пунктаў не адпавядае патрабаванням і санітарным нормам, яны зачыняюцца. Такая сітуацыя была дэталёва вывучана сенатарам з выездам на месца сумесна з прадстаўнікамі Міністэрства аховы здароўя, Мінскага аблвыканкама і Клецкага райвыканкама.

Гаворка аб закрыцці фельчарска-акушэрскага пункта ў вёсцы Колкі Клецкага раёна Мінскай вобласці, які не адпавядаў патрабаванням і санітарным нормам. Гэтую навіну насельніцтва ўспрыняла хваравіта, што і зразумела: сёння ў вёсцы пражываюць 94 чалавекі — у асноўным людзі сталага веку, сярод іх ёсць інваліды і адзінокія.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, падчас разгляду абмяркоўваліся пытанні транспартных зносін пры неабходнасці звароту жыхароў вёскі ў іншыя бальніцы, арганізацыі медыцынскай дапамогі пажылым людзям і інвалідам, забеспячэння даступнасці лекавых сродкаў.

— Калі закрыцця не пазбегнуць, то трэба ўлічваць, ці змогуць пацыенты дабрацца да ўрача і як наладжана транспартнае паведамленне. Мясцовыя ўлады павінны знаходзіць варыянты, каб пры адсутнасці фельчарска-акушэрскіх пунктаў людзі маглі выехаць да ўрача і атрымаць медыцынскую дапамогу. Важна, калі ўсё вырашаецца комплексна, — перакананы Віктар Лісковіч. — Акрамя таго, амбулаторыі, участковыя бальніцы, паліклінікі вобласці, якія сёння забяспечаны аўтатранспартам, павінны ажыццяўляць выезд урача да пацыентаў на дом, патранажы фельчараў і памочнікаў урачоў. У тым ліку медыцынская дапамога можа быць арганізавана з дапамогай перасоўных медыцынскіх комплексаў.

Сенатар падкрэслівае: у зоне пастаяннай увагі — даступнасць якаснай медыцынскай дапамогі ў рэгіёнах, у тым ліку лекавага забеспячэння незалежна ад месца пражывання грамадзян.

Паводле яго, ключавая роля ў стварэнні ўмоў для якаснай і даступнай медыцынскай дапамогі належыць раённаму звяну аховы здароўя. Неабходна ў кожнай вёсцы раёна, дзе няма фельчарска-акушэрскага пункта, аператыўна правесці першасны скрынінг насельніцтва, распрацаваць дарожную карту абследавання і лячэння жыхароў, якія маюць патрэбу ў гэтым, — да такога заключэння прыйшлі па выніках паездкі.

Для гэтага ў раёне сілы і сродкі для медыцынскага забеспячэння жыхароў маюцца на належным узроўні.

Адзначым напрыканцы, што зварот будзе знаходзіцца на кантролі ў Савеце Рэспублікі да вырашэння ўзнятага пытання.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

«НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА НЯПРОСТЫЯ ЎМОВЫ, НІВОДНЫ ПРАЕКТ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ ДЗЯРЖАВЫ НЕ БЫЎ СПЫНЕНЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 7–й стар.)

— А сістэма аховы здароўя — гэта тое, што важна для кожнага з нас, — перакананa спікер.

Яна шчыра павіншавала ўдзельнікаў з адкрыццём у сталіцы абноўленага аб'екта сістэмы аховы здароўя і падзякавала Мінскаму гарвыканкаму за дакладную палітыку правядзення ў жыццё задач, якія стаяць перад аховай здароўя, і іх эфектыўную рэалізацыю. Словы ўдзячнасці адрасаваліся таксама будаўнікам, якія ў сціслыя тэрміны якасна справіліся з задачай, і медыцынскім работкам, якія не спынілі сваёй дзейнасці на перыяд рамонту і абнаўлення.

У якасці падарунка Старшыня Савета Рэспублікі ўручыла сертыфікат на ўльтрагукавое абсталяванне.

Усім удзельнікам урачыстасці Наталля Качанава пажадала найлепшага, а краіне — міру і спакою ў рэалізацыі задач, якія стаяць перад сістэмай аховы здароўя.

У размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі ўдакладніла, што задачы, якія ставіць Прэзідэнт краіны, абсалютна выверaныя і ідуць ад жыцця.

— Тое, што мы займаемся рэканструкцыяй, мадэрнізацыяй ужо існуючых аб'ектаў аховы здароўя (тым самым выконваючы даручэнне Кіраўніка краіны), — правільныя, выразна выверaныя пазіцыі ў сістэме аховы здароўя, — упэўнена Наталля Качанава. — Вы бачыце гэта на прыкладзе 16-й паліклінікі, якая абслугоўвае досыць вялікую колькасць людзей, жыхароў сталіцы. Сёння тут завершаны ўсе работы, паліклініка ўведзена ў эксплуатацыю, укамплектаваная сучасным абсталяваннем, і гэта абсалютна правільна.

Паводле яе меркавання, разам з набыццём сучаснага абсталявання павінна павышацца і заработная плата медыцынскім работнікам.

— Мы разумеем: якім бы дасканалым і сучасным абсталяванне ні было, без урача, медыцынскай сястры функцыянаваць яно не будзе, — адзначыла яна.

Адказваючы на пытанне пра ўплыў санкцый на пастаўкі медыцынскага абсталявання, Наталля Качанава запэўніла: пытанне знаходзіцца на кантролі ўрада і профільнага міністэрства.

— Прэзідэнт паставіў задачу: у нас павінна быць усё, людзі не павінны адчуць ніякага санкцыйнага ціску і ў сістэме аховы здароўя ў тым ліку, — пракаментавала Старшыня Савета Рэспублікі і дадала: — Мы бачым, матэрыялы, якія выкарыстоўваліся для капітальнага рамонту ў гэтай паліклініцы, беларускія; устаноўлена сучаснае абсталяванне айчыннай вытворчасці. Вядома, сёння ва ўрадзе і Міністэрстве аховы здароўя робіцца ўсё, каб пастаўкі лекавых прэпаратаў і запасных частак для сучаснага абсталявання, якімі аснашчаны паліклінікі, медыцынскія ўстановы, былі своечасовыя. Таму не варта хвалявацца — гэтыя пытанні знаходзяцца на кантролі. У тым ліку і мы, як члены Савета Рэспублікі, кантралюем сітуацыю, працуючы напрамую з паліклінікамі, аптэкамі, каб бачыць рэальную сітуацыю. Таму будзе зроблена ўсё, каб сістэма аховы здароўя функцыянавала стабільна, нягледзячы на перыпетыі, якія ёсць у свеце ў адносінах да нашай краіны.

Ацэньваючы сённяшнюю падзею ў жыцці сталіцы, **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ** падкрэсліў:

— Выдатна, калі ў нашым горадзе праходзяць падзеі, якія радуюць жыхароў сталіцы. Усе з нецярпеннем чакалі, калі паліклініка пачне дзейнічаць у поўным аб'ёме. На сёння мы зрабілі ўсё, каб ва ўстанову паступіла сучаснае абсталяванне. Гэта дае магчымасць аказваць дапамогу на самым высокім узроўні. Упэўнены, супрацоўнікам паліклінікі таксама будзе прыемней працаваць практычна ў новым будынку. Радасна ўсведамляць, што мы сапраўды зрабілі вялікую карысць для нашых людзей.

Паводле яго слоў, у цэлым сістэмных праблем па забеспячэнні кадраў у сталіцы няма, аднак гарадскія ўлады працягваюць дзейнасць у гэтым кірунку.

— Запланавалі павялічыць наборы ў медыцынскія каледжы, каб маглі ўпэўнена сябе адчуваць па забеспячэнні сярэднім медыцынскім персаналам. Гэта ўзгоднена з Міністэрствам адукацыі. Ужо сёлета для навучання спецыялістаў павялічаны наборы, каб праблема, якая яшчэ ёсць па забеспячэнні сярэднім медыцынскім персаналам, была ў найбліжэйшыя два гады вырашана, — патлумачыў Уладзімір Кухараў.

Таксама ён расказаў, што ў сталіцы ў цяперашні час вельмі шмат мадэрнізуецца і будуецца медыцынскіх аб'ектаў.

— Так, 11-я бальніца знаходзіцца на рэканструкцыі, 5-я і 4-я бальніцы таксама з'яўляюцца важнымі аб'ектамі і аказваюць меддапамогу вялікай колькасці жыхароў сталіцы. Акрамя таго, запланаваны ўвод паліклінік на Даўгабродскай, у Сухарава. Чатыры паліклінікі знаходзяцца на капітальным рамонце і рэканструкцыі. Пачынаем праектаваць новую інфекцыйную бальніцу на 240 ложкаў, якая таксама будзе скіравана на вырашэнне пытання для даслага насельніцтва. У нас ёсць праграма ў горадзе па планаванні рэканструкцый і капітальных рамонтаў, будаўніцтве новых аб'ектаў, мы ідзём па графіку. Усё робім для таго, каб гэтая праграма была рэалізавана, — патлумачыў старшыня Мінгарвыканкама.

Што датычыцца сённяшняй падзеі — урачыстага адкрыцця 16-й гарадской клінічнай паліклінікі, яе **галоўны ўрач Ала МАРЦІШЭВІЧ** расказала, што на дадзены момант гэта ўстанова аховы здароўя абслугоўвае 49 тысяч жыхароў Цэнтральнага і Савецкага раёнаў.

— З улікам таго, што ў нас вялікі раён абслугоўвання, было прынята рашэнне рамантаваць паліклініку без адсялення, таму што пацыентам дабірацца далёка, — расказала галоўны ўрач і выказала меркаванне, што з пастаўленай задачай установа справілася.

> Прэзідэнт паставіў задачу: у нас павінна быць усё, людзі не павінны адчуць ніякага санкцыйнага ціску і ў сістэме аховы здароўя ў тым ліку.

Паводле яе слоў, праектна-каштарыснай дакументацыяй былі выдзелены тры пускавыя комплексы.

— Цяпер мы скончылі трэці. Ён рабіўся хутка, быў насычаны абсталяваннем. І ўсё планаванае абсталяванне, якое трэба было закупіць, мы зрабілі, — кажа Ала Марцішэвіч.

Яна адзначае, што прыемна працаваць у прыгожым і ўтульным будынку, але супрацоўнікі і пацыенты перш за ўсё чакалі менавіта новае абсталяванне.

— На сёння з новага абсталявання ў нас устаноўлены два лічбавыя рэнтген-апараты, лічбавы пульмаскан, ёсць і новыя УГД-апараты. Абсталяваны працоўныя месцы для вузкіх спецыялістаў — ЛОРа, афтальмолага. Цалкам перааснашчана хірургічнае аддзяленне, жаночая кансультацыя, клініка-дыягнастычная лабараторыя, — пералічвае кіраўнік установы. — Шырокай базай валодае і рэабілітацыйнае аддзяленне. У нас адзіная на некалькі раёнаў спелеалячэбніца, дзе мы будзем абслугоўваць і жыхароў іншых раёнаў. Яна выкарыстоўваецца для рэабілітацыі пацыентаў, лячэння пацыентаў з захворваннямі органаў дыхання, у тым ліку для рэабілітацыі тых, хто перанёс ковід-інфекцыю. Насельніцтва дастаткова немаладое, і людзям такая рэабілітацыя вельмі патрэбна.

Галоўны ўрач таксама расказала, што ў іх устаноўлены апараты электра- і святлолячэння. Дзейнічае водалячэбніца, дзе ёсць ванная для падводнага душа-масажу, розныя душы, у тым ліку вугляkіслая ванна.

— Самае галоўнае — гэта спецыялісты. Кадраў, каб працаваць на гэтым абсталяванні, на сёння ў нас дастаткова, — тлумачыць кіраўнік установы. — Ёсць усе вузкія спецыялісты. З 1 жніўня пачнуць працаваць яшчэ два хірургі — маладыя спецыялісты, урач-отарыналарынголаг, урач-акушэр-гінеколаг і ўрач агульнай практыкі. Працуе 17 маладых спецыялістаў сярэдняга звяна, з іх 13 — мэтавікі.

Вольга АНУФРЫЕВА,
фота Рамана КЛЮЧЫНА.

Далучайцеся!

У вас ёсць патэнцыял? Раскрыйце яго!

Распачаўся конкурс «Маладыя таленты Беларусі»

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё абвяшчае правядзенне музычнага конкурсу «Маладыя таленты Беларусі». Упершыню праект адбыўся ў 2009 годзе, а сёлетні XI конкурс пройдзе пад адзнакай Года гістарычнай памяці. Дасыласць заяўкі да ўдзелу ў першым туры можна да 31 сакавіка ўключна. Праект пазіцыянуецца як конкурс, які дапамагае маладым выканаўцам раскрыць свой патэнцыял, таму ўзроставы дыяпазон канкурсантаў даволі шырокі — ад 10 да 25 гадоў. Паспрабаваць свае сілы можна будзе ў чатырох намінацыях: «эстрадны вакал», «інструментальная музыка», «акадэмічны вакал» і «спадчына».

З адметнасцяў «Маладых талентаў Беларусі — 2022» можна вылучыць тое, што тэмай першага тура стануць песні на роднай мове. Арганізатары прапануюць удзельнікам абраць любімую беларускую песню, запісаць відэа выступлення і дасласць яго на электроную пошту праекта. Акрамя дыстанцыйнага адбору канкурсантаў, запланаваны і вочныя сустрэчы з сяброўкамі журы ў Вялікай студыі Дома радыё ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі.

Імёны пераможцаў стануць вядомыя ў маі, адзін з галоўных прызоў — магчымасць пачуць сябе ў эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё. Сачыць за навінамі праекта можна як у Telegram-канале «Радыё 1», так і ў інфармацыйных выпусках Агенцтва тэленавін на «Беларусь 1».

Арына КАРПОВІЧ.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 161

№ 32

Першыя дзве кампазіцыі дасланы Вадзімам Булат (Мінск)

№ 32

Белыя простыя: c1, e1, g1, h2, a3, g3 (6).

Чорныя простыя: e3, f4, a5, e5, d6, d8 (6).

№ 33

Белыя простыя: e1, g1, b2, d2, h2, f4, e5, g5, f6 (9).

Чорныя простыя: a3, h4, a5, c5, h6, g7, f8, h8 (8).

Наступныя мініяцюры складзеныя вядучым аддзела.

№ 34

Белыя простыя: 46, 43, 36, 37, 32, 30, 25 (7).

Чорныя простыя: 38, 26, 21, 18, 12, 9, 4 (7).

№ 35

Белыя простыя: 48, 43, 36, 40, 32, 35, 22 (7).

Чорныя простыя: 38, 26, 20, 12, 9, 10 (6).

№ 36

Белыя простыя: 46, 48, 50, 45, 26, 24, 25 (7).

Чорныя простыя: 42, 37, 39, 31, 35 (5).

Наступныя кампазіцыі складзеныя па правілах бразільскіх шашак.

№ 37 Д. Камчыцкі (Магілёў).

Белыя простыя: g1, f2, e3, f4, g5, f6, c7 (7).

Чорныя простыя: b2, b4, a5, b6, h6, d8, h8 (7).

№ 38 В. Шульга (Мінск)

Белыя простыя: a1, h2, f4, e5, g5, b6 (6).

Чорныя простыя: b2, a3, c3, g3, a7, e7 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 160 ад 04.03.22.

№ 25 1. g7-h8 e3:g5 2. h8-g7 h4:f2 3. e5-d6 c7:e5 4. g7:a3 +

№ 26 1. e3-f4 g5:e3 2. e7-d8 c5:e7 3. d8:a5 a3-b2

[3...h4-g3 4. h2:f4 a3-b2 5. a5-c3 b2:d4 6. f4-e5 d4:f6 7. g1-f2]

4. a5-c3 b2:d4 5. h2-g3 h4:f2 6. g1:c5 x

№ 27 1. 46-41 36:38 2. 48-43 38:49 3. 44-39 49:46

[3...49:41 4. 39:08 26:37 5. 08-03 15:24 6. 03:47]

4. 39:08 15:24 5. 08-03 26:37 6. 03:05 +

№ 28 1. f2-g3 h4:f2 2. c7-b8 a5:e5 3. b8:b4 f8:d6 4. b4:h6 +

№ 29 1. f6-g7 c5:e3 2. g5-f6 e3:e7 3. g7-f8 a7:c5 4. f8:g1 + ПР: 1. f6-e7 c5:e3 2. e7-d8! a7:c5 3. g5-f6 e3:e7 4. d8:h4:e1:c3:a1 x (знайшоў С. Бурко)

№ 30 1. g1-h2 f4:d2 2. h2:h6 d2-c1 3. f2-g3 h4:f2 4. e1:g3 a7-b6 5. g3-f4 c1:g5 6. h6:f4 b6-c5 7. f4-e5 +

№ 31 1. a7-b8 g3:e1 2. b8:e3/c1 Ткачоў 1974 г. f6-g5

[2...e1-c3 3. e3-d2 c3:e1 4. g1-f2 e1:g3 5. h4:f2]

3. e3:h6 e1-c3 4. h6-d2 c3:e1 5. g1-f2 e1:g3 6. h4:f2 +

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

«Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сваё кіно

Чытайце ў часопісе «Алеся» ў сакавіку

Толькі сапраўднае мастацтва захапляе і дорыць крылы

У пачатку студзеня Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь займеў новага генеральнага дырэктара. Упершыню ў гісторыі Вялікага ім стала жанчына — доктар мастацтвазнаўства, прафесар, старшыня савета спецфонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Кацярына Дулава.

Аб перспектывах развіцця славутага калектыву, адказнасці кіраўніка, прынцыпах выхавання і сакрэтах асабістага поспеху Кацярына Дулава расказала ў інтэрв'ю «Алесі».

КУЙ ЖАЛЕЗА, ЛЮБІ ЯГО ГАРАЧА

Мастак Марыя Тарлецкая пераканаўная: метал сам абраў яе і даў ёй сур'ёзную перавагу ў прафесіі. Жанчын-кавалёў у Беларусі — адзінкі. І факт прыналежнасці да традыцыйна мужчынскай справы па вызначэнні прыцягвае ўвагу і выклікае цікавасць да яе работы.

За 20 гадоў дружбы з металам Марыя Тарлецкая выкавала з сябе майстра са сваім вядомым почыркам. Яе работы ёсць у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, у прыватных замежных калекцыях. Усе аўтарскія скульптуры майстра прадыктаваныя пачуццямі: захапленнем, болем, гневам, спагадай — і нясуць магутны эмацыянальны пасыл. Яе апошняя скульптура — заўсёды самая любімая.

НАШ МОЗГ — СЯБАР ЦІ ВОРАГ?

Навуковыя даследаванні галаўнога мозга пакуль не ўдаецца разгадаць? Колькі яго працэнтаў мы насамрэч выкарыстоўваем? Ці заўсёды трэба думаць пазітыўна? Як развіваць і падтрымліваць кагнітыўныя здольнасці? Пра гэта нам распавяла кандыдат біялагічных навук, дацэнт, загадчыца лабараторыі нейрафізіялогіі Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі **Святлана Пашкевіч.**

АРЫФМЕТЫКА КАХАННЯ

Якімі б моцнымі ні былі пачуцці мужчыны і жанчыны адно да аднаго, у матэрыяльным свеце ёсць сіла, здольная на іх сур'ёзна паўплываць. Гэта грошы. Яны — той «трэці», які ніколі не бывае лішнім і якога нельга ігнараваць.

Фінансавыя рознагалоссі, вельмі балючыя, зацяжныя, часам прыводзяць да поўнага краху шлюбу, ператвараюць калісьці любячых партнёраў у злосных ворагаў.

Ці здольны агульны кашалёк умацаваць шлюб? Як перажыць перыяды, калі даход сям'і змяншаецца, ці, наадварот, рэзка ўзрастае? Ці можа, напрыклад, шлюб паміж марнатраўнай жанчынай і скупым мужчынам стаць гарманічным? Каментуе гэта і многае іншае псіхолаг **Таццяна Шаранда**.

САМЫЯ МОДНЫЯ ІДЭІ

Калі прачытаеце дадзены артыкул, у вас будзе поўная яснасць наконт таго, якімі рэчамі трэба папоўніць свой гардэроб, каб адпавядаць трэндам вясны-лета — 2022.

«Са «Звяздою» — спадручней!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або на I паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 прасаў Holt HT-IR-010 і суперпрыз — пыласос Samsung VCC4131S3A/XEV. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26 красавіка 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 чэрвеня 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або на першае паўгоддзе 2022 года і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 41 ад 1 сакавіка 2022 года.

Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4159 ад 24.02.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал 2022 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____ *(аддзяленне сувязі)*

на II квартал 2022 года

Хатні адрас і тэлефон *(абавязкова)* _____ *(індэкс)*

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.40 Зона Х (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40 Навіны надвор'я.
11.00, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Кругаварот» (12+).
13.05, 15.25 Драма «Забываючыся пра ўсё» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.20 Арэна.
1.00 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 10.50, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.05 «На тыдзень» (16+).
11.20 «Гарфілд» (12+).
12.35 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
13.20 «Вось такія людзі» (12+).
14.00 «Да спаткання» (16+).
14.40 Трылер «Чужы» (16+).
16.40 «Тры першыя спатканні» (16+).
17.25 Драма «Адораная» (12+).
19.10 «На кручку» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.20 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).
22.15 Хачу ў тэлевізар!
22.20 Серыял «Такая работа» (16+).
0.00 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 15.35, 20.30, 23.40 Навіны культуры.
8.15, 19.05 «Пані Марыя». Маст. фільм (12+).
9.40 «Нацыянальны хіт-парад».
10.35 «Закаханы па ўласным жаданні». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.40 «Суразмоўцы».
12.55 «Наперад у мінулае».
13.20, 21.05 «Легенды кіно» (12+) [СЦ].
14.00, 21.40 «Калі дрэвы былі вялікія». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.45 «Навукаманія» (6+).
8.20, 9.40, 11.00, 12.50, 14.45, 15.40, 17.00, 19.05, 21.40, 23.40, 1.05, 2.30, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Эліта Краіны Саветаў» (12+).
13.30 Мастацкі фільм «Вячэрні звон» (18+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.35 Дак. фільм «Саша. Лета» (18+).
22.00 «Колба часу» (16+).
23.00 «Блеф-клуб» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.30 Маст. фільм «Спосаб забойства» (18+).

EuroSport 1

0.45, 3.30, 7.00, 10.30, 14.30 Веласпорт. «Вуэльта Каталоніі» (16+).
1.45, 19.55, 23.55 Навіны (16+).
1.50, 8.30, 12.30, 15.30, 15.50 Скачкі на лыжах з трамплінаў. КС. Мужчыны (16+).
4.30, 8.00, 11.30 Веласпорт. «Тры дні Бруге — Дэ-Панне». Жанчыны (16+).
5.00 Снукер. Gibraltar Open (6+).
13.30 Аўтагонкі на выносліваць. «1000 міль Себрынга» (16+).
20.00 Фігурнае катанне. ЧС. Жанчыны.

Кінакамедыя

0.35 Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу (16+).
2.15 Як ведаць... (16+)
4.30 Галівудскія копы (12+).
6.40 Таксі-3 (16+).
8.15 Таксі-4 (16+).
9.55 Старскі і Хатч (12+).

11.45 Знаёмства з бацькамі (12+).
13.45 Знаёмства з Факерамі (12+).
15.55 Знаёмства з Факерамі-2 (16+).
17.45 Выдатніца лёгкіх паводзін (16+).
19.30 Прывіды былых сябровак (16+).
21.20 50 першых пацалункаў (16+).
23.10 Копі цара Саламона (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.30 «Гадзіннік кахання» (16+).
10.25 «Паглядзім» (12+).
10.55 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.10 «Любоўная магія» (16+).
12.45, 18.00, 1.50 «Сляпая» (16+).
13.50, 19.10, 2.45 «Варажбітка» (16+).
14.55, 3.40 «Апакаліпсіс» (16+).
16.00 «Знахаркі» (16+).
17.00 «Ведзьмакі свету» (16+).
20.20 «Апошні самурай» (16+).
23.00 «Маўчанне ягнят» (18+).
1.00 «Знахаркі» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.05, 5.45, 17.15, 18.05 Элементарна (16+).
6.45 Тры метры над узроўнем неба (16+).
9.00 Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу (16+).
11.20 Сэрцаед (16+).
13.15 Кілеры (16+).
15.05 Містар і місіс Сміт (16+).
19.00 Чорны лебедзь (16+).
20.55 Прэстыж (16+).
23.15 Ілюзіяніст (16+).
1.10 Ніколі не здавайся (16+).
3.00 Малая на мільён (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.40 Географ глобус прапіў (16+).
7.40 Піраміда (16+).
9.35 Часовыя складанасці (12+).
11.05 Пальма (6+).
13.05 Мамы (12+).
15.05 З Новым годам, мамы! (6+)
16.35 Мамы-3 (12+).
18.15 Цень зоркі (16+).
20.00 Мажор. Фільм (16+).
21.45 Рубеж (12+).
23.35 Кіліманджара (16+).
0.55 Цой (16+).
2.20 Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
4.25 Дарагі тата (12+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.30 Панарама 360 градусаў. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
7.20, 8.10 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
9.00, 10.40 Інстынкт выжывання (16+).
9.50, 23.35, 0.25 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
11.35 Дзікі тунец (16+).
12.25, 16.45 Злавіць кантрабандыста (16+).
13.15, 14.05, 17.35 АўтаSOS (16+).
14.55, 21.50 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
15.50 Кантрабанда з Марыянай ван Зелер (16+).
18.25, 18.50 Фабрыка ежы (16+).
19.15, 20.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.00, 3.30 Галандская берагавая ахова ў Карыбскім моры (16+).
22.45 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
1.10, 2.00 Асушыць акіян (16+).
2.45 Тайная гісторыя каралекрушэнняў (16+).
4.20 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
5.05, 5.35 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 21.15 Як гэта зроблена? (12+)
12.05, 13.00 Залатая ліхаманка (16+).
13.55, 14.20, 14.5, 15.15, 15.45, 16.10 Склады (16+).
17.35 Круты цюнінг (12+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Разбуральнікі легенд (16+).
23.05, 1.50, 2.45, 3.40, 5.14 Смяротны ўлоў (18+).
0.00, 6.01 Аперацыя «Выратаванне дома» (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
8.50 Слова Архібіскупа Іосіфа Станеўскага на свята Дабравешчання Дзевы Марыі.
9.10 Серыял «След» (16+).
10.50, 0.55 «Скажынемаўчы».
11.50, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Драма «Кругаварот» (12+).
13.55 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.40, 15.25 Драма «Ангеліна» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Сэнс жыцця (12+).
17.30 Маршрут пабудаваны (12+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.50 Серыял «Сельскі дэтэктыў» (12+).
0.40 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.10 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.00 Серыял «Такая работа» (16+).
12.30 «Сямейныя гісторыі» (16+).
13.00 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.50 «Арол і рэшка. 10 гадоў» (16+).
14.45 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
15.10 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.45 М/с «Казуркі» (0+).
18.15 «На нажах» (16+).
19.10 «Клон». Серыял (16+).
20.05, 21.15 «Тата папаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.55 «Амаль былыя» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 14.45, 20.30, 23.30 Навіны культуры.
8.15, 15.20 «Учора скончылася вайна». Серыял (12+) [СЦ].
9.45 «Гісторыя Беларусі. Бітвы».
10.10 «Імёны Беларусі. Ян Чэрскі». Дак. фільм (6+) [СЦ].
10.20, 21.05 «Сем нявест яфрэйтара Збруева». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.10 «Сіла веры».
12.30, 18.10 «Дзяржаўная граніца» (12+) [СЦ].
15.00 «Хатынь. Вайна без правіл» (12+).
16.55 «Жывая спадчына».
17.20 «Камертон».
17.45 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.40 «Калыханка» (0+).
22.40 «Кадры жыцця».

Беларусь 5

7.00 Тэніс. WTA.
9.00 Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Пары.
11.05 Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. «Авангард» (Омск) — «Металург» (Магнітагорск).
12.50 Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Танцы на лёдзе.
16.25 Авертайм.
16.55 Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. «Трактар» (Чэлябінск) — «Салават Юлаеў» (Уфа).
19.20 Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя.
21.50 Вось гэта спорт!
22.10 Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
23.45 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэасапсопіс.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00, 11.15 Серыял «І ўсё ж я люблю...» (16+)
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 22.55 Серыял «Кроў анёла» (16+).
15.05, 16.45, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
21.15 Фільм «Залатая нявеста» (16+).
0.40 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30,19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.00 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 0.50 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.10 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.45, 16.50 «Смак забойства». Серыял (16+).
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Тайны Беларусі».

МІР

5.00 Серыял «Паміж двух агнёў» (12+).
7.40, 10.20 Серыял «Свае» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15, 17.10 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.15 «Гульня ў кіно» (12+).
21.00 «Сусветныя гульні розуму» (16+).
21.35 Маст. фільм «Вакзал для дваіх» (12+).
0.15 Маст. фільм «Старыя-разбойнікі» (12+).
1.50 Маст. фільм «Вясна» (12+).
3.30 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
3.55 Мультфільмы (6+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Вести.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Фільм «Маналог» (12+).
21.05 Фільм «Згубленае шчасце» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

610 «Астрапрагноз».
6.15, 7.25, 8.25, 16.35, 19.50, 21.55, 23.15 Сёння. Галоўнае.
6.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).
7.10 Сфера інтарэсаў.
7.40 «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
13.50 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
14.40 «ДНК» (16+).
15.40, 16.45 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
18.05 «Чакай мяне» (12+).
20.05 «Следства вялі...» (16+)
21.30, 22.35 «Краіна талентаў» (12+).
23.55 Дакументальны цыкл «Вечная Айчынная» (12+).

8 канал

7.00, 16.00, 19.55, 21.10, 1.30 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (12+).
8.00 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).
9.00 Дэтэктыў «Паляўнічыя на дыяменты» (16+).
16.05 «Хачу ў кіно» (12+).
16.10 Мультпарад. «Чыпаліна» (6+).
16.50 Серыял «Заблытаныя лёсы» (12+).
18.20 Драма «Аазіс кахання» (16+).
20.00 Серыял «Першая мадэль» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.15 Баявік «Гадзіла супраць ворага» (12+).
23.00 «Героі коміксаў на экране». «Першы мсціўца. Супрацьстаянне» (16+).

ВТБ

6.05 «Лаві момант» (16+).
7.00, 9.00 «Раніца з гумарам» (16+).
11.00, 22.45 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.05 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.05, 18.30 Серыял «#СеняФедзя» (16+).
15.35 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
16.40, 0.55 Серыял «Пагналі» (16+).
20.00 Серыял «Модны сіндыкат» (16+).
21.00 Камедыя «Глядзі як я» (12+).
0.00 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
2.35 Серыял «Кадэцтва» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.50 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 18.35, 1.15 «Жыццё, якое прыйшло з космасу». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 18.20 «Тэатр і кіно на паштоўках Сярэбранага стагоддзя».
8.55, 16.35 «Варчына зямля». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.10 XX стагоддзе.
12.15, 22.25 «Бярозка». Серыял [СЦ].
13.05 Штучны адбор.
13.45 «Аляксей Папоў. Трагедыя ў трох актах з пралогам і эпілогам». Дак. фільм.
14.30 «Школа будучыні» [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 «Белая студыя».
17.35, 2.10 Максім Венгераў і Ваг Папян.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Семінар».
20.45 «Добрай ночы, малыя!»
21.00 «Абсалютны слых».
21.40 Улада факта.
23.20 «Дом архітэктара» [СЦ].

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
7.00, 8.45, 9.40, 11.00, 13.50, 14.30, 15.40, 17.00, 20.20, 21.40, 23.00, 3.40 Музычная настальгія (12+).
7.20 Мастацкі фільм «На мурамскай дарожцы» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Быў час» (16+).
13.30 Маст. фільм «Спосаб забойства» (18+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
18.50 Мастацкі фільм «Падзенне» (18+).
1.00, 5.25 «Блеф-клуб» (16+).
1.40 «Музычная гавань Элеаноры Філінай» (16+).
4.00 Мастацкі фільм «Мяшэрскія» (16+).

EuroSport 1

0.00, 2.30, 5.00 Аўтагонкі на выносліавсць. «1000 міль Себрынга» (16+).
1.00, 3.30, 11.35, 18.00, 23.35 Веласпорт. «Вуэльта Каталоніі» (16+).
1.55, 11.30 The Minute (16+).
2.00 Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
6.30 Горныя лыжы. КС. Каманды (16+).
7.30, 8.00, 9.00, 19.00, 19.40. Горныя лыжы. КС. Мужчыны (16+).
8.30, 9.30, 10.0. Горныя лыжы. КС. Жанчыны (16+).
13.05 Фігурнае катанне. ЧС. Жанчыны.
20.25, 23.30 Навіны (16+).
20.30 Фігурнае катанне. ЧС. Пары.

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.50 «Гадзіннік кахання» (16+).
10.45 «Перыскоп» (16+).
11.05 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.20 «Любоўная магія» (16+).
12.55, 17.00 «Старац» (16+).
14.05, 18.50, 2.40 «Сляпая» (16+).
15.15, 20.00, 3.35 «Вадражбітка» (16+).
16.25 «Любоўная магія» (16+).
18.10 «Уінджы» (12+).
21.10 «Я ведаю твае сакрэты» (16+).

Кінакамедыя

1.20 Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара (12+).
3.55 Астэрыкс і Абелікс: «Місія Клеапатра» (12+).
5.55 Белыя людзі не ўмеюць скакаць (16+).
8.05 Аферысты Дзік і Джэйн (12+).

9.45 Чаго хоча дзяўчына (12+).
11.40 Даспехі Бога (16+).
13.20 Даспехі Бога: аперацыя «Ястраб» (12+).

15.20 Копі цара Саламона (12+).
17.15 Знаёмства з Факерамі (12+).
19.30 Знаёмства з Факерамі-2 (16+).
21.15 Старскі і Хатч (12+).
23.10 Таксі-3 (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Цой (16+).
7.00 Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
9.15 Бацька (16+).
10.45 Пальма (6+).
12.45, 4.35 Самы Новы год! (16+)
14.10 Шалёнае вяселле (16+).
15.55 Шалёнае вяселле-2 (16+).
17.50 Тайна пячаткі дракона (6+).
20.00 Ён — дракон (6+).
21.55 Эбігейл (6+).
23.55 Індыга (16+).
1.30 Дзень да (18+).
2.55 Мажор. Фільм (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.30 Панарама 360 градусаў. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
7.20, 8.10 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
9.00, 10.45 Інстынкт выжывання (16+).
22.15 «Апярэджваючы стрэл» (16+).
23.20 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.25 «Лінія абароны» (16+).
1.00 «Прывідная прыгажосць» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.00, 5.40, 17.20, 18.10 Элементарна (16+).
6.50 З 13 у 30 (12+).
8.40 Вялікі (12+).
10.40 Гонар і прадузятасць (12+).
13.00 Яшчэ адна з роду балейн (16+).
15.10 Джэйн Эйр (12+).
19.00 Вялікі тата (12+).
20.40 Мой хлопчык (12+).
22.30 Чалавек-Павук (12+).
0.40 Чалавек-Павук-2 (12+).
2.45 Чалавек-Павук-3 (12+).

Discovery

8.00, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 21.15 Як гэта зроблена? (12+)
12.05 Як уладкаваны Сусвет (16+).
13.00 Давід Андрэс каляскіць па свеце (16+).
13.55, 14.50, 15.54 Брудная работка (12+).
17.35 Круты цюнінг (12+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Разбуральнікі легенд (16+).
23.05, 5.14 Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
0.00, 6.01 Голыя і напалоханыя (16+).
1.20, 7.12 Дзіўны свет жывёл (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 24 сакавіка ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.10 Зона Х (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.50, 0.45 «Скажынемаўчы».
11.50, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Кругаварот» (12+).
13.55 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.40, 15.25 Драма «Ангеліна» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
23.50 Сфера інтарэсаў.
0.30 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.10 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 23.40 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.00, 22.10 Серыял «Такая работа» 16+).
12.30 «Сямейныя гісторыі» (16+).
13.00, 21.15 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.55 «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
14.45 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
15.15 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.50 М/с «Кузуркі» (0+).
18.15 «Арол і рэшка. 10 гадоў» (16+).
19.10 «Клон». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 14.50, 20.30, 23.30 Навіны культуры.
8.15, 15.30 «Учора скончылася вайна». Серыял (12+) [СЦ].
9.45 «Гісторыя Беларусі. Бітвы».
10.15 «Імёны Беларусі. Айзек Азімаў». Дак. фільм (6+) [СЦ].
10.20, 21.05 «Чужая радня». Маст.фільм (12+) [СЦ].
12.40, 18.15 «Дзяржаўная граніца» (12+) [СЦ].
15.00 «Хатынь. Вайна без правіл» (12+).
16.55 «Жывая спадчына».
17.25 «Камертон».
17.50 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.40 «Калыханка» (0+).
22.40 «Кадры жыцця».

Беларусь 5

7.00 Слэм-данк.
7.30 Хакей. КХЛ.
9.35 Матч-пойнт.
10.10, 17.55 Тэніс. WTA.
12.20 Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
19.20 Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. «Авангард» (Омск) — «Металург» (Магнітагорск).
22.00 Хакей для ўсіх.
22.35 Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2022. Партугалія — Турцыя.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10, 11.15 Серыял «І ўсё ж я люблю...» (16+)
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 22.45 Серыял «Кроў анёла» (16+).
15.05, 16.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 Серыял «Яначар» (16+).
0.30 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30,19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.00 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 20.50, 0.50 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.10 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
16.50 «Вялікія таямніцы» (16+).
20.20, 23.05 «СТБ-спорт».
20.25 «Сталічныя падрабязнасці».
20.35 «Міншчына».

МІР

5.00, 3.05 Серыял «Паміж двух агнёў» (12+).
7.50, 10.10, 23.50 Серыял «Свае» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 18.05 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.10 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.10 «Гульня ў кіно» (12+).
20.55, 21.55 «Слабае звяно» (12+).
22.55 «Назад у будучыню» (16+).
2.00 Маст. фільм «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Земскі доктар» (12+).
21.05 Серыял «Лізавета» (16+).
22.10, 23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.25, 8.25, 16.35, 19.50, 21.55, 23.15 Сёння. Галоўнае.
6.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).
7.10 Сфера інтарэсаў.
7.40 «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
13.50 «За гранню» (16+).
14.40 «ДНК» (16+).
15.40, 16.45 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
20.05, 22.20 Серыял «Порт» (16+).
23.30 Серыял «Захоп» (16+).

8 канал

7.00, 16.05, 19.55, 21.15, 1.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 16.10 Мультпарад (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (12+).
8.15 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).
9.10, 11.20 Драма «Ідучы за сэрцам» (16+).
10.40 Серыял «В'етнам».
12.50 «Драйв выжывання»
13.40 Прыгодніцкі фільм «Цуда-жанчына» (12+).
16.20 Серыял «Заблытаныя лёсы» (12+).
17.50 «Смачнае кіно». «Вострыя прыправы і жарсці» (12+).
20.00 Серыял «Першая мадэль» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.05 «Салам алейкум, Беларусь!»
21.20 Баявік «Мужчынскія слёзы» (16+).
23.05 Трылер «Падзенне анёла» (16+).

ВТВ

6.05 «Лаві момант» (16+).
7.00, 9.00 «Раніца з гумарам» (16+).
11.00, 23.00 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Гатуем як шэф» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.05 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.05, 18.30 Серыял «#СеняФедзя» (16+).
15.35 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
16.40, 0.55 Серыял «Пагналі» (16+).
20.00 Серыял «Модны сіндыкат» (16+).
21.00 Драма «Крок наперад: усё або нічога» (12+).

0.00 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
2.35 Серыял «Кадзетва» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.50 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Легенды сусветнага кіно.
7.35, 18.35, 1.15 «Жыццё, якое прыйшло з космасу». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 18.20 «Партрэт эпохі. Гісторыі, расказаныя фотапаштоўкай».
8.55, 16.35 «Варчына зямля». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.10 XX стагоддзе.
12.15, 22.25 «Бярозка». Серыял [СЦ].
13.10 «Абсалютны слых».
13.50 Астравы.
14.30 «Школа будучыні» [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Пернікавы домік [СЦ].
15.45 «2 Вернік 2».
17.35, 2.10 Аліса Вайлерштайн, Паава Ярві і Аркестр дэ Пары.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 Адкрытая кніга [СЦ].
20.30 Колер часу.
20.45 «Добрай ночы, малыя!»
21.00 Кіно аб кіно.
21.40 «Энігма. І-Пінь Янг».
23.20 «Дом архітэктара».

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
7.05, 8.30, 9.40, 11.00, 14.20, 15.40, 17.00, 18.50, 20.45, 21.40, 23.00, 1.00, 2.45, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.30 Мастацкі фільм «Спосаб забойства» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
12.50 Мастацкі фільм «Падзенне» (18+).
18.00 «Эліта Краіны Саветаў» (12+).
19.30 Мастацкі фільм «Вячэрні звон» (18+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.20 Мастацкі фільм «Намурамскай дарожцы» (18+).

EuroSport 1

0.30, 4.30, 8.00, 11.30, 23.45 Веласпорт. «Тры дні Бруге — Дэ-Панне». Мужчыны (16+).
2.00, 5.00 Снукер. Turkish Masters (6+).
3.30, 7.00, 10.35, 18.00 Веласпорт. «Вуэльта Каталоніі» (16+).
8.30, 9.30, 12.55, 19.00 Скачкі на лыжах з трамплінаў. КС. Мужчыны (16+).
10.30 The Minute (16+).
12.25 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
14.00 Фігурнае катанне. ЧС. Мужчыны.
19.30, 20.15 Фігурнае катанне. ЧС. Пары (6+).
20.10 Навіны (16+).

Кінакамедыя

0.45 Галівудскія копы (12+).
2.55 Таксі-5 (18+).
4.40 Паміж намі, хлопчыкамі (16+).
6.35 Таксі (16+).

8.15 Таксі-2 (16+).
9.50 Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу (16+).
11.25 Мая мачаха — іншапланецянка (12+).
13.25 Удачы, Чак (16+).
15.15 Чаго хоча дзяўчына (12+).
17.15 Вам ліст (16+).
19.30 Ходзяць чуткі (12+).
21.20 З рэчамі на вылет! (16+)
23.00 Таксі-4 (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.40 «Гадзіннік кахання» (16+).
10.35 «Улецы» (12+).
11.05 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.25 «Любоўная магія» (16+).
13.00, 17.00 «Старац» (16+).
14.05, 18.45, 2.40 «Сляпая» (16+).
15.10, 19.55, 3.35 «Варажбітка» (16+).
16.20 «Любоўная магія» (16+).
18.10 «Уінджы» (12+).
21.05 «Я ведаю твае сакрэты» (16+).
22.10 «Апярэджваючы стрэл» (16+).
23.15 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.15 «10 самых» (16+).
0.50 «Ваўкі» (18+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.15, 5.55, 17.15, 18.05 Элементарна (16+).
7.00 Мой хлопчык (12+).
8.55 Вялікі тата (12+).
10.35 Адзінаццаць сяброў Оўшэна (16+).

12.45 Дванаццаць сяброў Оўшэна (16+).
15.05 Трынаццаць сяброў Оўшэна (16+).
19.00 Тры метры над узроўнем неба (16+).
21.15 Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу (16+).
23.35 Сэрцаед (16+).
1.25 Містар і місіс Сміт (16+).
3.20 Кілеры (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.35, 16.00 Ён — дракон (6+).
8.35 Тайна пячаткі дракона (6+).
10.45 Індыга (16+).
12.30 Эбігейл (6+).
14.30 Дарагі тата (12+).
18.00 Піраміда (16+).
20.00 Часовыя складанасці (12+).
21.30 Географ глобус прапіў (16+).
23.40 Як Надзя пайшла за гарэлкай (18+).
1.05 Мамы (12+).
2.50 З Новым годам, мамы! (6+)
4.05 Мамы-3 (12+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.15 Панарама 360 градусаў. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
7.00, 7.55 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
8.45, 10.25 Інстынкт выжывання (16+).
9.40, 12.05, 16.30, 23.35, 0.25 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
11.15 Дзікі тунец (16+).
13.10, 14.00, 17.35 АўтаSOS (16+).
14.50 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
15.45 Кантрабанда з Марыянай ван Зелер (16+).
18.25, 18.50 Фабрыка ежы (16+).
19.15, 20.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.00, 21.50, 3.55 Злавіць кантрабандыста (16+).
22.40 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
1.30, 2.15 Асушыць акіян (16+).
3.05 Тайная гісторыя каралекрушэнняў (16+).
4.45 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
5.35 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 21.15 Як гэта зроблена? (12+)
12.05 Эд Стафард: гульня на вылет: Эд супраць Мэта Райта (16+).
13.00 Голыя і напалоханыя (16+).
17.35 Круты цюнінг (12+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Разбуральнікі легенд (16+).
23.05, 0.00, 0.55, 5.14, 6.01, 6.48 Залатая ліхаманка (16+).
1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Склады (16+).
4.27 Разбуральнікі легенд: рок і люстасць (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

ДЫСЦЫПЛІНА І ПАРАДАК ВА ЎСІМ

На экспертным савеце пры Савеце Рэспублікі разгледзелі актуальныя пытанні развіцця грамадства

Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ эксперты абмеркавалі праекты заканадаўчых актаў развіцця ваенна-патрыятычных клубаў і аграэкатурызму ў нашай краіне.

Фота БелТА.

Праект дакумента, што датычыцца развіцця ваенна-патрыятычных клубаў, падрыхтаваны ў мэтах стварэння ўмоў для ўсебаковага развіцця, актывізацыі маральнага і патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі, павышэння іх матывацыі да праходжання вайсковай службы і службы ў праваахоўных органах.

— Мы прызываем моладзь двойчы ў год. Атрымліваецца так, што восеньскі набор праходзіць заўсёды добра, мы ўкамплектоўваемся на 105—110 %. Вясновы набор праходзіць крыху больш складана, укамплектоўваецца асабістым складам дзесьці 55—60 %, — расказаў **намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі Беларусі Мікалай КАРПЯНКОЎ.** — Многія маладыя людзі хочуць вучыцца ў вышэйшых навучальных установах: хтосьці паступае, а хтосьці пабойваецца арміі. Глыбей вывучаючы гэтае пытанне, мы ўбачылі, што трэба раней пачынаць займацца ваенна-патрыятычным выхаваннем нашай моладзі. Рабіць лёгкую прышчэпку ад боязі арміі. Самы прымальны ўзрост — 10—15 гадоў. Паглыбіўшыся ў гэтыя пытанні, мы вырашылі арганізаваць у сябе ваенна-патрыятычныя клубы.

Пілотны праект быў рэалізаваны на базе брыгады спецыяльнага прызначэння вайсковай часці 3214, дзе быў створаны ваенна-патрыятычны клуб «Рысь».

— У самым пачатку мы чакалі, што прыйдуць маладыя людзі, бо кожнае лета ў нас праводзяцца кругласутачныя лагеры. Чакалі 50 чалавек, а прыйшло 100. Дзецям настолькі гэта спадабалася, што кожны тыдзень да нас прыходзілі яшчэ па 10—20 чалавек, — кажа намеснік міністра. — Мы ўбачылі, што адной вайсковай часцю не можам ахапіць такую вялікую колькасць ахвотных.

Паводле яго слоў, і хлопчыкі, і дзяўчынкі гатовыя займацца рознымі відамі падрыхтоўкі: спецыяльнай, агнявой, страявой, медыцынскай, каб валодаць усімі неабходнымі жыццёвымі навыкамі.

— Тут жа мы адкрылі клубы «Граніт» у вайсковай часці 5448, «Адвага» — 5529, у Мінскай вобласці — на базе вайсковай часці 3310. Бачым вялікі інтарэс і жаданне маладых людзей туды прыходзіць. Ім падабаюцца стасункі з афіцэрамі, сяржантамі, салдатамі. Створаны камфортныя ўмовы для заняткаў спецыяльнай баявой падрыхтоўкай, — кажа Мікалай Карпянкоў.

Намеснік міністра паведаміў, што ва ўнутраных войсках адкрыта 17 ваенна-патрыятычных клубаў.

— Літаральна ўчора адкрыты клуб «Бастыён» у Ваўкавыску. Улада ўжо ведае, што трэба для такіх клубаў: купляюць ціры, форму, рыштунак. Засталося толькі адкрыць 18-ы клуб у Гомелі. Тады ва ўсіх часцях і злучэннях і воінскіх унутраных войсках будуць ваенна-патрыятычныя клубы, — адзначае эксперт.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА пераканана: ініцыятыва цудоўная і неабходная:

— Яна вельмі патрэбна, і тое, што такія атрады павінны стварацца пры Міністэрстве абароны, Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, пагранічных войсках, — няма сумневу.

Са свайго боку **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ** падкрэсліў: члены экспертнага савета падтрымліваюць праект заканадаўчага акта аб стварэнні ваенна-патрыятычных клубаў.

— Яго рэалізацыя будзе спрыяць грамадзянскаму, ваенна-патрыятычнаму выхаванню дзяцей і моладзі, паляпшэнню матывацыі да праходжання вайсковай службы ў праваахоўных органах, — упэўнены старшыня профільнай камісіі.

У цэлым, эксперты прыйшлі да высновы, што прыняцце дакумента дазволіць замацаваць парадак стварэння, дзейнасці ваенна-патрыятычных клубаў на тэрыторыі злучэнняў і воінскіх часцей, іх фінансавання, а таксама забяспечыць рэалізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі шляхам адраджэння ваенна-патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі.

***

Што датычыцца разгляду нарматыўнага прававога акта па дзейнасці аграэкасядзіб, то ўдзельнікі савета адзначылі, што яго дзеянне павінна быць накіравана на ўдасканаленне дзейнасці аб'ектаў аграэкатурызму.

Наталля Качанава звярнула ўвагу ўдзельнікаў экспертнага савета на тое, што ўдасканаленне сістэмы аграэкатурызму павінна зыходзіць з меркаванняў розных бакоў і да разгляду гэтага пытання трэба падыходзіць комплексна. Спікер пераканана: парадак у гэтай сферы трэба навесці, бо наспеў цэлы шэраг пытанняў, якія патрабуюць урэгулявання. Напрыклад, прагучала меркаванне, што сядзібы, якія аказваюць паслугі для адпачынку, варта размяшчаць удалечыні ад жылых дамоў.

— Калі ў рэжыме нон-стоп у такіх месцах праходзяць вяселлі і ўрачыстасці, многія мясцовыя жыхары скардзяцца на гучную музыку і шум. Таму тое, што тут неабходна навесці парадак, абсалютная праўда, — упэўнена сказала спікер верхняй палаты парламента.

Наталля Качанава адзначае, што прывілеі, якімі карыстаюцца ўладальнікі сапраўдных аграэкасядзіб, не павінны распаўсюджвацца на тых, хто займаецца арганізацыяй банальных свят на прыродзе.

— Гэта не азначае, што нельга арганізоўваць святы. Кожны старшыня райвыканкамаў за тое, каб развіваліся фермерства, аграсядзібы, таму што гэта азначае занятасць людзей, прывядзенне ў парадак тэрыторый. Калі ж там учыняецца бардак, гэта недапушчальна. У дачыненні да такіх асоб мы павінны мець магчымасць прыцягнуць іх да адказнасці за неправамерныя дзеянні. Таму яшчэ раз уважліва паглядзім на ўсе аспекты. Трэба не нашкодзіць, а ўпарадкаваць гэты від дзейнасці, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

На думку **старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіла РУСАГА,** які ў свой час стаяў каля вытокаў стварэння адпаведнага заканадаўчага акта, аграэкатурызм — адзін з кірункаў, які дазволіць развіць сельскія тэрыторыі, прыцягнуць турыстаў, уцягнуць у абарот унікальныя прыродныя рэсурсы.

— Шмат скептыкаў, але быў прыняты ў аператыўным парадку спрошчаны Указ Прэзідэнта № 372, які дазволіў у самы кароткі час прадпрымальным людзям уключыцца ў дзейнасць і стварыць гэтую сферу, — патлумачыў сенатар. — Сёння мы маем больш за тры тысячы такіх сядзіб. На мой погляд, яны адбыліся, і перашкаджаць ім не трэба. Эканамічная сітуацыя, якая склалася ў свеце, дазволіць зрабіць яшчэ адзін крок беларускаму турыстычнаму бізнесу ў напрамку развіцця аграсядзіб. Гэта магчымасць не толькі для нашых людзей, але і грамадзян Грузіі, Расіі, Казахстана загрузіць у поўным аб'ёме гэтыя аб'екты.

Са свайго боку **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Віктар ЛІСКОВІЧ** адзначыў: развіццё аграэкатурызму апраўдала сябе па шэрагу прычын.

> Рэалізацыя праекта будзе спрыяць грамадзянскаму, ваенна-патрыятычнаму выхаванню дзяцей і моладзі, паляпшэнню матывацыі да праходжання вайсковай службы ў праваахоўных органах.

— Перш за ўсё, гэта захаванне і развіццё вёсак, беларускай самабытнасці. З вялікай павагай стаўлюся да людзей, якія бяруць некалькі дамоў на аднаўленне ў вёсках, якія знаходзяцца ўдалечыні ад вялікіх гарадоў. Пакуль такія вясковыя дамы будуць існаваць, паверце, яны заўсёды будуць прыцягваць нават моладзь, — перакананы сенатар. — У той жа час мы павінны працягнуць развіваць гэты кірунак, не дапускаць пагаршэння стану тых, хто ўжо гэтую галіну развіваў. Павінна быць дысцыпліна і парадак. Праект заканадаўчага акта якраз і накіраваны на ўпарадкаванне гэтай дзейнасці.

У заключэнне савета яго ўдзельнікі прыйшлі да высновы аб неабходнасці працягу работы ў гэтым кірунку з улікам заўваг і прапаноў, выказаных падчас пасяджэння.

Наша даведка

Экспертны савет быў створаны ў чэрвені 2021 года па даручэнні кіраўніка дзяржавы, каб аналізаваць эфектыўнасць праектаў заканадаўчых актаў па найважнейшых пытаннях развіцця краіны.

У склад савета ўваходзяць найбольш аўтарытэтныя навукоўцы і практыкі з розных абласцей.

Акрамя таго, да ўдзелу ў пасяджэннях экспертнага савета запрашаюцца спецыялісты па канкрэтных профільных пытаннях.

Вольга АНУФРЫЕВА.

У ТЭМУ

ПАТРЫЯТЫЧНЫ МАРШРУТ

Нарада па пытаннях рэалізацыі сумеснага расійска-беларускага праекта «Цягнік Памяці» прайшла ў Савеце Рэспублікі.

— Мы праводзім чарговую рабочую нараду, прысвечаную падрыхтоўцы і правядзенню ў нашай краіне сумеснага расійска-беларускага праекта «Цягнік Памяці», які стартуе 22 чэрвеня, — расказаў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.** — Сёння мы дэталёва з кожным рэгіёнам нашай краіны прапрацуем маршрут руху, прыпыначныя пункты, культурную праграму, харчаванне — увогуле ўвесь сацыяльны пакет.

Паводле слоў старшыні профільнай камісіі, удзельнікамі праекта з кожнага боку стануць па сто маладых людзей. Суправаджаць праект з беларускага боку будзе Савет Рэспублікі і Міністэрства адукацыі. Сенатар падкрэсліў: арганізатары зробяць усё неабходнае, каб праект прайшоў на высокім узроўні, а кожны прыпыначны пункт адрозніваўся індывідуальнасцю.

— Каб моладзь адчула атмасферу не проста свята, але і прасякнулася гістарычным мінулым, перш за ўсё тых гарадоў, якія яны будуць наведваць, — падкрэсліў Віктар Лісковіч.

Старшыня профільнай камісіі паведаміў таксама, што распрацоўваецца цікавае культурнае суправаджэнне праекта. На нарадзе, дарэчы, прайшла папярэдняя абарона праграм знаходжання цягніка ў кожным з рэгіёнаў краіны.

Віктар Лісковіч выказаў упэўненасць, што выбудаваная сістэма дазволіць не толькі правесці разавае мерапрыемства, а зрабіць гэты праект штогадовым і рэгулярным.

Па тэрыторыі нашай краіны «Цягнік Памяці» пройдзе праз Брэст, Гродна, Віцебск, Оршу, Гомель, Магілёў і фінішуе ў дзень вызвалення беларускай сталіцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — 3 ліпеня — у Мінску.

На тэрыторыі Расіі ён зробіць прыпынкі ў Смаленску, Маскве, Вялікім Ноўгарадзе, Санкт-Пецярбургу. Усе 15 дзён дзеці і службовыя асобы, якія іх суправаджаюць, наведаюць новыя пункты. Ноччу цягнік будзе перамяшчацца з горада ў горад, а днём чакаецца насычаная праграма.

— Удзельнікамі праекта з'яўляюцца дзесяцікласнікі. Гэта практычна ўжо дарослыя маладыя людзі, якія скончаць школу і потым будуць вызначацца з прафесіяй, сваёй будучыняй. Веданне мінулага, гісторыі дазволіць ім сфарміравацца як паўнавартасным грамадзянам сваіх дзяржаў, — перакананы Віктар Лісковіч.

Вольга АНУФРЫЕВА.

УМОВЫ СПРЫЯЛЬНЫЯ

Савет Рэспублікі ратыфікаваў пагадненне аб цэнах на пастаўку прыроднага газу

СЕНАТАРЫ на пасяджэнні восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання ўхвалілі законапраект «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змянення ў Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб парадку фарміравання цэн (тарыфаў) пры пастаўцы прыроднага газу ў Рэспубліку Беларусь і яго транспарціроўцы па газаправодах, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ад 25 лістапада 2011 года».

Як паведаміў міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ, законапраект распрацаваны з мэтай захавання ўнутрыдзяржаўных працэдур, прадугледжаных для выказвання згоды Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе пратакола аб унясенні змяненняў у пагадненне аб цэнах на газ ад 25 лістапада 2011 года і з мэтай наступнага ўступлення ў сілу. Пратакол аб цэнах на газ быў падпісаны 9 лістапада 2021 года.

Дакументам прадугледжваецца канкрэтызацыя і прадаўжэнне да 31 снежня 2022 года тэрмінаў іншага парадку вызначэння цаны на імпартаваны расійскі газ шляхам заключэння паміж урадам Беларусі і ПАТ «Газпрам» асобнага двухбаковага дакумента. У выніку ў 2022 годзе цана на прыродны газ для Рэспублікі Беларусі складае 128,52 долара за тысячу «кубоў».

— Ратыфікацыя гэтага пратакола патрабуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі, — патлумачыў у гутарцы з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.** — Вельмі актыўна папрацавалі нашы Міністэрства энергетыкі і ўрад. З расійскімі калегамі выйшлі на лічбу, якая дазволіць нашай краіне сэканоміць каля 500 мільёнаў долараў пры паступленні газу па цане, якая закладзена ў пратаколе. Лічу, гэта вельмі важкі вынік, асабліва ў цяперашніх умовах, калі спатавыя цэны дзесьці даходзілі да 3,9 тысячы долараў за тысячу кубічных метраў, але ў нас цана будзе зусім іншая.

Паводле меркавання старшыні профільнай камісіі, захаванне кошту прыроднага газу, які закупляецца ў ПАТ «Газпрам», на ўзроўні 2021 года акажа станоўчы ўплыў на павышэнне канкурэнтаздольнасці айчынных вытворцаў. Сяргей Рачкоў папрасіў калег падтрымаць законапраект, з чым яны і пагадзіліся.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ДЗЕЛЯ ПАДТРЫМАННЯ СТАБІЛЬНАСЦІ І БЯСПЕКІ

Сенатары ратыфікавалі пагадненне аб міратворчай дзейнасці АДКБ

НА восьмай сесіі Савета Рэспублікі парламентарыі разгледзелі законапраект «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змен у Пагадненне аб міратворчай дзейнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ад 6 кастрычніка 2007 года».

Праект закона прадставіў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН,** які паведаміў прысутным, што законапраект падрыхтаваны з мэтай выказвання згоды Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе пратакола аб унясенні змен у пагадненне аб міратворчай дзейнасці АДКБ, падпісанага 16 верасня 2021 года ў Душанбэ.

— Пратаколам уносяцца змены ў пагадненне аб міратворчай дзейнасці АДКБ, якія ўдакладняюць механізм удзелу падраздзяленняў міратворчых сіл Арганізацыі ў міратворчых аперацыях, што праводзяцца пад эгідай ААН, — патлумачыў міністр абароны.

Паводле яго слоў, ратыфікацыя пагаднення значна пашырыць іх сферу дзеяння пры выкананні задач па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі, а таксама будзе садзейнічаць умацаванню іміджу і аўтарытэту АДКБ на міжнароднай арэне.

Акрамя таго, Віктар Хрэнін паведаміў, што пратаколам пагадненне ўводзіцца тэрмін «каардынуючая дзяржава». Гэта адна з дзяржаў — членаў Савета аб калектыўнай бяспецы, — якая вызначаецца для вырашэння арганізацыйных пытанняў і пытанняў усебаковага забеспячэння выкарыстання міратворчых сіл у аперацыях ААН па падтрыманні міру.

— Таксама прадугледжваецца, што для выкарыстання ў аперацыях ААН па падтрыманні міру міратворчыя сілы ствараюцца пад эгідай каардынуючай дзяржавы. Умовы ўдзелу міратворчых сіл у аперацыях ААН па падтрыманні міру вызначаюцца ў пагадненні, якое заключаецца каардынуючай дзяржавай з упаўнаважанымі падраздзяленнямі ААН, — кажа міністр абароны. — Асобныя пытанні, звязаныя з уключэннем міратворчага кантынгенту ў калектыўныя міратворчыя сілы, прадугледжаны да выкарыстання ў аперацыях ААН па падтрыманні міру, рэгламентуюцца ў двух- і шматбаковых пагадненнях паміж каардынуючай дзяржавай і іншымі дзяржавамі — членамі АДКБ.

Як патлумачыў у гутарцы з журналістамі сутнасць навацый **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ,** адна з актуальны тэм — працяг удасканалення заканадаўчай асновы для дзейнасці міратворчых сіл АДКБ, у прыватнасці ўзаемадзеянне міратворчых сіл АДКБ з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый.

— Ёсць дамоўленасць паміж кіраўнікамі дзяржаў — членаў АДКБ аб актывізацыі гэтай дзейнасці, — адзначыў сенатар.

Як падкрэсліў пры прадстаўленні законапраекта міністр абароны Віктар Хрэнін, змены, якія ўносяцца Пратаколам пагадненне аб міратворчай дзейнасці АДКБ, адпавядаюць нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь. Старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі са свайго боку падтрымаў выступоўцу і рэкамендаваў калегам ухваліць законапраект.

***

Сенатары ратыфікавалі дамовы з Расіяй аб падаўжэнні тэрміну знаходжання ваенных аб'ектаў.

Таксама быў разгледжаны законапраект «Аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў», які быў падрыхтаваны Міністэрствам абароны.

Як патлумачыў профільны міністр Віктар Хрэнін, праект закона падрыхтаваны з мэтай выказвання згоды Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе пэўных міжнародных дагавораў, якія датычацца парадку выкарыстання і ўтрымання радыёстанцыі ў Вілейцы і вузла ў Баранавічах, размешчаных на тэрыторыі нашай краіны.

— Пагадненнямі вызначаюцца прававыя падставы размяшчэння расійскіх ваенных аб'ектаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, — патлумачыў кіраўнік ваеннага ведамства і адзначыў, што ўмовы дакументаў адпавядаюць нашым нацыянальным інтарэсам.

Віктар Хрэнін паведаміў, што ўмовамі пагаднення таксама прадугледжваецца працаўладкаванне грамадзян нашай краіны для работы на расійскіх ваенных аб'ектах.

— У кантэксце апошніх тэндэнцый у міжнароднай палітычнай, эканамічнай сітуацыі на беларускім напрамку працяг тэрмінаў дзеяння пагадненняў пацвярджэннем нашых абавязацельстваў у рамках Саюзнай дзяржавы, а таксама стане падставай для рэалізацыі перспектыўных планаў развіцця двухбаковага ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, — падкрэсліў выступоўца.

Як удакладніў у гутарцы з журналістамі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь яшчэ з савецкіх часоў функцыянуе некалькі ваенных аб'ектаў.

— Гэта не ваенныя базы Расійскай Федэрацыі, — кажа старшыня профільнай камісіі. — Падышоў тэрмін падаўжэння адпаведных дамоўленасцяў Міністэрства абароны з расійскімі калегамі.

Сенатар падкрэсліў, што падчас разгляду гэтай тэмы было знойдзена ўзаемапрымальнае рашэнне.

— На сёння ў прынцыпе мы задаволены тым, якія рашэнні былі знойдзены. Гэта забяспечыць працяг шчыльнага ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі ў сферы бяспекі, — перакананы Сяргей Рачкоў.

Паводле яго слоў, гэтыя рашэнні прынятыя на ўзаемнавыгаднай аснове.

— Тут ёсць пытанні абароны, фінансаў, эканомікі, а таксама сацыяльныя. У прыватнасці, на гэтых аб'ектах працуюць і будуць працягваць працаваць беларускія грамадзяне, атрымліваючы добрае ўзнагароджанне, — рэзюмаваў ён.

Вольга АНУФРЫЕВА.

МЕРКАВАННЕ

Алег ДЗЯЧЭНКА: «У Беларусі ёсць усё, што трэба простаму чалавеку ў гэты неспакойны час»

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, прарэктар па вучэбнай частцы Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова аб дапамозе этнічным беларусам, якія пражываюць ва Украіне.

— У сувязі з трагічнымі падзеямі, выкліканымі эскалацыяй ваеннага канфлікту, разбурэннем грамадзянскай інфраструктуры, асабліву актуальнасць набывае пытанне аб аказанні гуманітарнай дапамогі этнічным беларусам, якія пражываюць у 22 абласцях Украіны. Паводле звестак апошняга ўкраінскага перапісу насельніцтва, колькасць беларусаў склала звыш 270 тысяч чалавек. Сёння многія з іх апынуліся ў зоне баявых сутыкненняў, пазбавіліся прытулку над галавой, сталі бежанцамі, — звяртае ўвагу сенатар.

Паводле яго меркавання, сітуацыя патрабуе ўсебаковага вывучэння і прыняцця адпаведных рашэнняў. Адзін з варыянтаў — даць усім ахвотным рэальную магчымасць для вяртання на сваю гістарычную радзіму.

— Беларусь выгадна адрозніваецца ад іншых рэгіёнаў Еўропы, куды накіроўваюцца патокі бежанцаў. У нас стабільная грамадска-палітычная і сацыяльна-эканамічная сітуацыя, для людзей створаны нармальныя ўмовы жыцця: праца, жыллё, сацыяльныя гарантыі. Галоўнае — мірнае неба над галавой. Адным словам, ёсць усё тое, што трэба простаму чалавеку ў гэты неспакойны час, — рэзюмуе Алег Дзячэнка.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 17 сакавіка 2022 года.

ДЗЕЛЯ МІРУ І СПАКОЮ ЛЮДЗЕЙ

Былы партызанскі камандзір у 60-я гады ўзначаліў брэсцкую міліцыю і шмат зрабіў для ўсталявання правапарадку ў самым заходнім рэгіёне краіны

Валерыя Асташонка перавялі ў сталіцу з пасады начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў у 1976 годзе. Але доўгія гады яшчэ многія і многія на Брэстчыне ўспаміналі кіраўніка міліцэйскага ведамства добрым словам. Зайшла неяк дачка Лілія Валер'еўна ў ЖЭС па даведку, а начальнік ёй насустрач: «Вы дачка Валерыя Паўлавіча? Я служыў пад яго кіраўніцтвам». І адразу стаў дзяліцца самымі добрымі ўражаннямі і ўспамінамі. Нават у паліклініцы медсястра згадала, як ёй даводзілася звяртацца ў міліцыю і як дапамаглі там.

У партызанскім атрадзе

Ветэраны ўнутраных спраў, каму давялося служыць у той час, у адзін голас гавораць: «Асташонак — гэта велічыня! Міліцэйскі генерал — інтэлігент, прафесіянал, чалавек самай высокай пробы». Успаміны бераўліва захоўваюць у музеі міліцыі і архіве ветэранскай арганізацыі Брэсцкага УУС. Асабліва шмат было зроблена для ўвекавечання памяці Валерыя Асташонка, калі арганізацыю ўзначальваў Георгій Длюбарскі. Але пра гэта крыху пазней.

Сёлета, дарэчы, споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння генерала. Ён нарадзіўся ў 1922 годзе ў вёсцы Слабада тагачаснага Сіроцінскага раёна Віцебскай вобласці. У школе хлопцу найлепей давалася гісторыя. Ён і думаў прысвяціць сябе выкладанню гэтай навукі, у 1941 годзе планаваў паступаць на гістфак педагагічнага інстытута. Але планы таго пакалення паламала вайна.

Адразу пасля акупацыі родных мясцін юнак падаўся ў партызаны. Яго баявая біяграфія звязана з партызанскай брыгадай «За Радзіму». І ўжо вясной 1942 года 20-гадовы Валерый стаў камандзірам узвода, а пазней быў прызначаны камісарам партызанскага атрада імя Валькова. Малады камісар заўсёды быў на пярэднім краі і вёў байцоў за сабой. Засталіся ўспаміны яго таварышаў аб тым, як камісар наладзіў работу з асабовым складам. Пры ім не было зафіксавана ніводнага выпадку марадзёрства, што вельмі важна. За гэта паважалі атрад у асяродку мясцовага насельніцтва і дапамагалі, чым маглі. Камандзірам атрада тады быў Міхаіл Чацверыкоў, начальнікам штаба — Кірыл Шлыкоўскі. У той перыяд малады партызанскі камісар атрымлівае ўзнагароды салдацкай доблесці: медалі «За баявыя заслугі», «За адвагу», шэраг іншых. Спачатку атрад дзейнічаў на тэрыторыі Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці, потым баявая адзінка змагалася на тэрыторыі Дзівінскага, затым Маларыцкага раёнаў Брэстчыны.

Знаходка ўсяго жыцця

Менавіта ў партызанах хлопец знаходзіць каханне ўсяго жыцця, свой лёс — Анастасію Лосеву. О, гэта была незвычайная гісторыя, тыя падзеі заслугоўваюць асобнага аповеду. Насця пайшла ў партызаны ў 16 гадоў. І ўжо ў атрадзе даведалася, што гітлераўцы забілі маці і малодшую сястру. Бацька дзяўчыны загінуў у 1944-м на фронце. Баявала яна спачатку ў другім атрадзе. Юная, бясстрашная, зусім нявопытная, падчас адной з аперацый трапіла ў рукі гітлераўцаў і аказалася ў канцлагеры «Шталаг 382» пад Барысавам. Гэта здарылася ўвесну 1942-га. Якое жыццё ў лагеры, вядома: голад, холад, рызыка быць застрэленым канваірамі з любой нагоды. Словам, Насця і яшчэ адна дзяўчынка вырашылі ўцякаць, як умелі, рыхтавалі сваю «аперацыю». У канцы вясны, калі пацяплела, яны здолелі выбрацца з лагера, але не прадугледзелі далейшыя падзеі. Дзяўчаты блукалі па лясах і рызыкавалі загінуць ад голаду альбо нарвацца на любых злыдняў. Схуднелых і змораных, да ўсяго іх аднойчы моцна пакусалі сабакі. Эсэсаўцы перыядычна выпускалі сабак, каб адшукваць уцекачоў. Ад сабак удалося ўцячы, але Насця, здаецца, канчаткова страціла сілы. А яшчэ ў яе на ўсё жыццё засталіся сляды ад укусаў і ўсё жыццё, асабліва на змену надвор'я, балелі ногі. Яна не магла глядзець на сабак пароды нямецкая аўчарка...

У той дзень па атрадзе дзяжурыў Асташонак, байцы далажылі, што ў лесе знайшлі змарнелую падарожніцу. Ён загадаў дапамагчы, паказаць жанчыну партызанскаму доктару. Потым згадаў пра выпадак праз некалькі дзён і зайшоў праведаць знойдзеную, распытаць, як аказалася ў лесе. А калі зайшоў у зямлянку, аслупянеў: перад ім была не кабета, а зусім дзяўчынка з раскошнымі светлымі валасамі. Ён жа ішоў толькі 18 год. Ці трэба казаць, што камісар закахаўся з першага погляду?!

Гэтую гісторыю апіша пазней сяброўка дачок Асташонка расійская літаратуразнаўца Валянціна Платаненка ў сваёй кнізе. А тады Насця, як яе называлі Ася, паціху ўлівалася ў жыццё атрада, некаторы час была разведчыцай. Праз год яны ажаніліся з камісарам, згулялі партызанскае вяселле. А пад перамогу, у сакавіку 45-га, у Асташонкаў нарадзілася старэйшая дачушка Лілія, з якой мы і гутарым пра Валерыя Паўлавіча. Дарэчы, і назвалі яе ў гонар адной са сваячак бацькі, якую расстралялі захопнікі. Усё тады было звязана з вайной.

Лілія Валер'еўна згадвае, што іх дом заўсёды быў адкрыты і гасцінны. Колькі сябе памятае, да іх перыядычна прыязджалі былыя саслужыўцы, таварышы па партызанскім атрадзе, потым іх дзеці. І бацькі ім шчыра радаваліся, усіх прывячалі, пакідалі на начлег.

На сустрэчы з баявымі партызанскімі сябрамі.

Часам дапамагалі, вырашалі нейкія праблемы. Яны і людзі іх пакалення вельмі любілі жыццё. Можа, таму, што пабачылі шмат гора і смерці, ведалі сапраўдную цану жыццю, умелі яго абарагаць і радавацца. Да свят паштальёны неслі ў дом мяхамі віншавальныя паштоўкі з розных гарадоў і вёсак, і ў адказ Анастасія Пятроўна з дочкамі, пазней з унучкамі пісала віншаванні на адрасы са старых запісных кніжак. А Валерый Паўлавіч вечарамі праглядаў гэтую карэспандэнцыю, усміхаўся, святлеў душой.

Служба ў міліцыі

Усё сваё пасляваеннае жыццё ён прысвяціў службе ў міліцыі. У першыя мірныя гады давялося ваяваць з бандамі, якія заселіў лясах. Гэта былі даволі небяспечныя аперацыі, такія ж, як у ваенны час. Пазней вырашалі другія задачы. За шаснаццаць гадоў службы Асташонак фактычна прайшоў шлях ад радавога міліцыянера да начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама. Упраўленне ўзначаліў у 1961 годзе і кіраваў ім 14 гадоў. Дакументы сведчаць, што за гэты час у вобласці карэнным чынам палепшылася крымінагенная сітуацыя. Па раскрыцці злачынстваў вобласць займала лідарскія пазіцыі ў БССР. Асаблівую ўвагу ўдзяляў начальнік пытанням падбору і расстаноўкі кадраў. Адным з галоўных дасягненняў Валерый Паўлавіч лічыў павышэнне аўтарытэту міліцыі ў насельніцтва, усёй сваёй дзейнасцю яны з калегамі сцвярджалі гэты аўтарытэт. У тую пару ён быў узнагароджаны за сваю работу ордэнамі «Знак Пашаны» і Працоўнага Чырвонага Сцяга, у 1966 годзе яму было прысвоена званне генерал-маёра.

Лілія Асташонак згадвае, што дома бацька ніколі не гаварыў пра работу, свядома аберагаў сям'ю ад трывог і любога негатыву. Толькі праз гады яны з маці выпадкова даведаліся ад саслужыўца пра здарэнне ў вайсковай часці. Мабыць, справа была ў тым, што зараз называюць нестатутнымі адносінамі. Словам, салдат зачыніўся ў танку і пагражаў расстраляць таго, хто наблізіцца. Камандзіры разгубіліся, сітуацыя выглядала болей чым сур'ёзна. Асташонку далажылі, бо надзвычайнае здарэнне адбывалася на тэрыторыі горада. Ён прыехаў, выйшаў з машыны ў грамадзянскім адзенні і пайшоў без зброі да танка. Ніхто не чуў, аб чым міліцэйскі начальнік гаварыў з салдатам тэрміновай службы, але праз нейкі час той вылез з баявой машыны, заплакаў і прыхіліўся да Валерыя Паўлавіча нібы да бацькі...

— А колькі і якіх сітуацый было ў яго штодзённай рабоце, калі меў справу са злачынцамі, бандытамі, мы і не здагадваліся, — расказвае Лілія Валер'еўна. — Ён быў з тых, пра каго гавораць, што гарэў на рабоце. У 1976 годзе быў прызначаны намеснікам начальніка Мінскай вышэйшай школы міліцыі. А ў лютым 1980 года памёр у шпіталі пасля сардэчнага прыступу ва ўзросце 58 гадоў. На здароўі не маглі не адбіцца і партызанская маладосць, і міліцэйская работа.

Каб справа жыла

Варта сказаць, што ў Брэсце памятаюць генерала Асташонка. На доме, дзе ён жыў, размешчана мемарыяльная дошка. А ў 2013 годзе на ўваходзе ў будынак абласнога УУС быў усталяваны барэльеф генерал-маёра Асташонка. 27 лістапада 2013 года сабралася шмат людзей на яго адкрыццё. Былі людзі, якія служылі побач з Валерыем Асташонкам. Яны згадвалі, акрамя бездакорнай службы, яго чалавечую прыстойнасць, высокую інтэлігентнасць, чуласць, гатоўнасць заўсёды дапамагаць людзям. Такім вось і павінен быць супрацоўнік, які стаіць на варце закона. Нездарма ж кіраўніцтва УУС увяло ганаровы пераходны прыз імя Валерыя Асташонка. Яго прысуджаюць штогод найлепшым вартавым парадку, і ўзнагарода лічыцца адной з самых прэстыжных у міліцэйскіх колах.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва Лілії АСТАШОНАК.

Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:

АГРОНОМ, ЗООТЕХНИК

Требования: высшее профильное образование, опыт работы в сельском хозяйстве, готовность и желание обучаться. Дисциплинированность, инициативность, исполнительность, умение работать с большим объемом информации, умение организовать и координировать работу, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

Предлагаем:
- Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- Трудоустройство согласно ТК РБ.
- Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
- Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
- Возмещение расходов по найму жилого помещения.
- Система мотивации получения результатов труда.
- Корпоративная безлимитная мобильная связь.
- Социальный пакет согласно коллективного договора.

Контакты:
Резюме отправлять на e-mail: mp@rodanagro.com
тел. +375 (33) 399-38-60, +375 (29) 318-22-65 (отдел кадров)
УНП 592000776

Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ:

ТРАКТОРИСТ-МАШИНИСТ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА

Требования: опыт работы на энергонасыщенных тракторах, дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

Предлагаем:
- Работу в современной компании с иностранным капиталом;
- Трудоустройство согласно ТК РБ.
- Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
- Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
- Возмещение расходов по найму жилого помещения.
- Система мотивации получения результатов труда.
- Корпоративная безлимитная мобильная связь.
- Социальный пакет согласно коллективного договора.

Контакты:
Резюме отправлять на e-mail: wp@rodanagro.com
тел. +375 (29) 935-70-20, +375 (29) 318-22-65 (отдел кадров)
УНП 592000776

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (Продавец)

Лот № 1:
Когенерационная установка JMS 620GS-N.L
производства австрийской фирмы «JenBacher», состоящей из двух модулей, 2009 г. в.

Адрес: Минский р-н, г. п. Мачулищи, ул. Солнечная, 6.
Начальная цена с НДС – 7851600,00 руб.
Задаток – 392580,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.
Штраф – 100 000,00 руб.

Аукцион состоится **06.04.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – **04.04.2022 в 11.00**.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by
УНП 190055182

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронного аукциона

Гаражи на 4 автомашины

(здание нежилое, инв. № 102/С-9461, общ. пл. 89,3 кв. м), расположенное по адресу: **Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114**

***Сведения о земельном участке*:** пл. 0,0245 га, предоставлен на праве аренды сроком по 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины

Начальная цена лота с НДС 20 % – 6 600,00 бел. руб.

Порядок ознакомления: в рабочие дни с 08.00 до 17.00, +375 (33) 673 28 47 (Мизюк Наталья Леонтьевна)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» по адресу: г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней после проведения Продавцом корпоративных процедур по согласованию заключения сделки (в случае заключения договора купли-продажи с единственным участником аукциона, выразившим согласие на приобретение Лота по начальной цене, увеличенной на 5 %). В ином случае (2 и более участников торгов) – **20 рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также оплатить организатору торгов вознаграждение в размере 3 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Условия электронных торгов: оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится Покупателем. Расходы по государственной регистрации перехода прав на объект недвижимости возлагаются на Покупателя

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 04.02.2022

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 18.04.2022 в 11.00. Окончание торгов: 18.04.2022 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.04.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» – www.ipmtorgi.by**

Контактные данные: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. **E-mail:** auction@cpo.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (Продавец) на праве хозяйственного ведения

Лот № 1: легковой специальный седан RENAULT LOGAN, кузов (рама) № X7LLSRB1HAH318373.
Местонахождение: г. Молодечно, ул. Богдана Хмельницкого, 22.
Начальная цена с НДС – 2 529,44 руб.

Лот № 2: легковой джип RENAULT DUSTER, кузов (рама) № X7LHSRDJN49843469.
Местонахождение: г. Молодечно, ул. Богдана Хмельницкого, 22.
Начальная цена с НДС – 4 408,12 руб.

Лот № 3: легковой универсал RENAULT DUSTER, кузов (рама) № X7LHSRDJN49843473.
Местонахождение: г. Дзержинск, ул. О. Кошевого, 1.
Начальная цена с НДС – 4 408,12 руб.

Лот № 4: грузопассажирский пикап «ФОЛЬКСВАГЕН КЭДДИ», кузов (рама) № WV2ZZZ2KZ8X153591.
Местонахождение: г. Минск, ул. Папанина, 7.
Начальная цена с НДС – 5 945,22 руб.

Лот № 5: легковой универсал RENAULT DUSTER, кузов (рама) № X7LHSRDJN49020964.
Местонахождение: г. Слуцк, ул. Виленская, 53.
Начальная цена с НДС – 4 380,95 руб.

Лот № 6: легковой седан RENAULT LOGAN, кузов (рама) № X7LLSRB1HAH318375.
Местонахождение: г. Борисов, ул. Орджоникидзе, 10.
Начальная цена с НДС – 2 529,44 руб.

Аукцион состоится **19.04.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел. + 375 29 688-04-88**

Предмет аукциона

Лот № 1
Местоположение – **г. Минск, ул. Замковая, 33**

Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц: ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копир. аппараты, пожар. сигнализация, источники бесперед. питания, компьют. сеть, система симметрич. связи, счетно-денеж. машинки, мебель, кабельная телеф. линия, системы вентиляции и кодиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**)

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 128 681,28 бел. руб. (снижена на 30 %)
Шаг аукциона – 6 434,06 бел. руб.

Лот № 2
Местоположение – **г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Помещение санитарно-бытового назначения	1,7 кв. м	500/D-7028275

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 3 108,00 бел. руб. (снижена на 30 %)
Шаг аукциона – 155,40 бел. руб.

Лот № 3
Местоположение – г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Административно-торговое помещение	733,5 кв. м	500/D-7023833

Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 624 560,00 бел. руб. (снижена на 30 %)
Шаг аукциона – 81 228,00 бел. руб.

Лот № 4
Местоположение – **г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а**

Кабинеты (административное помещение)	87,9 кв. м	500/D-708041778

Составные части и принадлежности: открытая автостоянка пл. 523 кв. м

Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 289 800,00 бел. руб. (снижена на 30 %)
Шаг аукциона – 14 490,00 бел. руб.

Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4: пл. **0,1469 га** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 17/50) для эксплуатации и обслуживания административного здания с магазином. ***Ограничения (обременения) прав:*** после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Порядок ознакомления: в рабочие дня по предварительному согласованию. +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (4 % – по лотам №№ 1, 2; 2 % – по лоту № 3, 3 % – по лоту № 4) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.03.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**05.04.2022 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата и время начала и окончания приема заявлений	**С 09.00 18.03.2022 до 17.00 04.04.2022** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by

ООО «Вельми Смачна»

информирует покупателей (потребителей) об организации возврата следующей продукции:

набор жевательной карамели «Капелька» микс и набор жевательной карамели: «ЛяБон» («ЛяБон» со вкусом Малина-сгущенка, «ЛяБон» со вкусом яблоко-дыня, «ЛяБон» со вкусом Арбуза, «ЛяБон» со вкусом Манго, «ЛяБон» со вкусом Грейпфрута) (изготовитель: АО «АККОНД», Россия).

Возврат можно осуществить в месте приобретения продукции или по адресу ООО «Вельми Смачна»: **г. Минск, Логойский тр-т, д. 37, пом. 7, оф. 19.**

УНП 192955293

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638**
Продавец	**ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70. УНП 100770618. Тел. +375 29 6139869**

Предмет аукциона

Лот № 1

Ограждение бетонное (инв. номер 980773).
Месторасположение: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/ 12

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 3 778,77 дол. США
Шаг аукциона – 188,94 дол. США

Адрес: г. Минск, пр-т Пушкина, 70
Лот № 2

Наименование	Общ. пл.	Инвен. номер
Административное, производственное	2007,2 кв. м	500/С-21619

В состав лота входит оборудование: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

Сведения о земельном участке: пл. **0,3600 га** предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 836 429,84 дол. США
Шаг аукциона – 41 821,49 дол. США

Лот № 3

В состав лота входят: **домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. номер 30121

Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 3 711,32 дол. США
Шаг аукциона – 185,57 дол. США

Лоты №№ 4–14 – оборудование, бывшее в употреблении.
Месторасположение: г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70

Лот, №	Наименование	Инвент. №	Начальная цена (с НДС 20 %), дол. США	Шаг аукциона*, дол. США
4	Аппарат гидроабразив. резки	70103	39 862,32	1 993,12
5	Вертик. обрабат. центр с ЧПУ ECO CENTER 350 CNC с системой упр. GPPlus 450	70089	14 736,78	736,84
6	Обрабат. центр(Si) Vector1500 CNC*CNC	41031	34 457,59	1 722,88
7	Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124	70124	39 159,10	1 957,96
8	Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4	41028	28 383,26	1 419,16
9	СТАН СП-2000	41008	75 810,00	3 790,50
10	Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133	70179	543 180,81	27 159,04
11	Токар. станок с ЧПУ Fanuc Oi-Mate с накладной станиной Compact 330	41034	15 905,84	795,29
12	Станок консольно-фрез. BM127M	41019	5 659,10	282,96
13	Станок отрезной ДОС	41012	189,48	9,47
14	Станок Hedelius-CB 80 Magnum	70147	53 334,90	2 666,75

***Шаг аукциона**	Шаг аукциона определяется продавцом в фиксированной сумме, которая не может составлять менее 5 % от начальной цены предмета торгов и не изменяется в течение всего аукциона

Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

Порядок ознакомления: в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 6139869 Дмитрий

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в т. ч. документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи – 7 (семь) дней после проведения аукциона

Срок оплаты предмета аукциона: не позднее **10 (десяти) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 10.02.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**04.04.2022 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата, время начала и окончания приема заявлений	**С 09.00 18.03.2022 до 17.00 01.04.2022,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by

ПЕРАМОГА БЫЛА ЗА НАМІ,

альбо Трэба чытаць класікаў

Гэтая гісторыя адбылася ў самым пачатку маёй педагагічнай дзейнасці. У школе, дзе я працавала, праводзіўся тыдзень беларускай мовы і літаратуры. Майму творчаму класу даручылі інсцэніроўку ўрыўка з якога-небудзь твора Міхаіса Лынькова.

Пасля бурных дэбатаў мы выбралі апавяданне «Дзед Аўсей і Палашка». Яны ўдваіх, калі каратка, з партызанскага атрада на кані паехалі па ваду на лясное возера і там захапілі ў палон немцаў, якія, пакінуўшы на беразе сваю вопратку і зброю, палезлі купацца...

Клас неяк адразу ўбачыў будучы спектакль і без прамарудвання ўзяўся за справу — спачатку, вядома ж, за падрыхтоўку дэкарацый. Для гэтага нехта з дому прынёс блакітнага атласу — бліскучай тканіны, для таго каб зрабіць «сапраўднае» возера, нехта — нарэзаў чароту на яго «берагі», нехта (у той самы сапраўдны чарот) пасадзіў цацачную, але «як жывую!» качку... На год старэйшыя хлопцы, адзін з якіх у свае пятнаццаць меў і славуты сажань у плячах, і пад два метры росту, падрадзіліся пабыць канём. Галаву і хвост са шпагату мы знайшлі яму ў школьных запасніках...

Далей паўстала пытанне, на чым можна везці бочку для вады?

У добрых людзей, якія жылі насупраць школы, вучні ўзялі напракат велікаватую тачку, і мы пачалі рэпетыцыі.

Трэба сказаць, што праходзілі яны не проста так, бо фантазія кіпела: вучні прагнулі імправізацыі, і — дай ім волю — у спектакль уключылі б такое, што Лынькову нават не снілася!..

У нечым мне прыйшлося трошкі саступіць: развучыць некалькі фраз на нямецкай.

І вось, нарэшце, наш час, наш выхад! У вялікай прахалоднай спартзале — вучні і настаўнікі, нават асобныя з бацькоў. Дзея пачынаецца вельмі сур'ёзна і прыстойна. Але ж потым некалькі непрадбачаных дробязяў, і...

Сур'ёзны, з лёгкім гумарам, твор шаноўнага пісьменніка ператвараецца ці не ў камедыю.

А ўсё з-за таго, што на тачцы восенню звозілі з агарода ўраджай. На колах засталася грязь — недзе прысохла, недзе прымерзла, а ў школе потым адтала (тачку прыкацілі загадзя)... І як толькі нашы дзед з Палашкай уладкаваліся «ў возе», і конь, заржаўшы, сарваўся ледзь не на галоп, падталыя кавалачкі гразі веерам паляцелі ў бок першакласнікаў, што сядзелі спераду на гімнастычнай лаўцы.

Па зале пракаціўся лёгкі смяшок.

А тым часам з хваляў «возера» ўжо вынырнуў першы ссінелы «немец» Сяргей і, пырснуўшы з роту струменьчыкам загадзя набранай вады (смех пачаўся сапраўдны), гаркнуў: «Das Wasser ist kalt!» («Вада халодная!»). — «Ja, ja», — тут жа падтакнуў яму «немец» другі, вылазячы «на бераг» у новых, спецыяльна набытых сямейных трусах у кветачкі.

Сцены ў зале скалануліся ад рогату... З-за якога трэці з нашых «немцаў» начыста забыў свой «тэкст» — выдаў першае, што прыйшло ў галаву: «Oh, mein Gott!» («О, мой божа!») і тым самым давёў гледачоў да стану поўнай эйфарыі.

...Дзея, тым не менш, магла завяршыцца на досыць высокай ноце, аднак гэтаму перашкодзіла яшчэ адна недарэчнасць. Наша Наташка (яна ж Палашка) была дзяўчынай худзенькай і невялічкай. Каб «ператварыць» яе ў сталую вясковую жанчыну, партызанскую кухарку, мы пайшлі на пэўныя хітрыкі.

І вось, нарэшце, той самы фінальны момант: дзед Аўсей пад дулам аўтамата гоніць перад сабою немцаў у партызанскі атрад, Палашка смела вядзе за аброць «каня», і раптам з-пад яе шырокай клятчатай спадніцы вывальваецца невялікая... падушка.

Умомант «пахудзелая» (знізу) гераіня, дзякуй богу, не губляецца: яна падбірае згубу са словамі: «Вось дзе мая падушачка! А я ўсю раніцу яе шукала!».

...Апладысменты былі бурнымі. Мае артысты тройчы выходзілі на паклон. Яны ж свята верылі ў свой проста феерычны поспех!

Не сумняваліся ў ім і гледачы «спектакля», бо нашы ж — дзед з Палашкай — перамаглі! Ды яшчэ і як: «немцаў» у палон узялі, вады ў партызанскі атрад прывезлі, падушку і тую знайшлі! Трэба чытаць Лынькова.

Алена Несцяронак,
г. Докшыцы.

СВЕТ І ЯГО АДКРЫЦЦЁ

Гэта было гадоў з дзесяць таму і амаль такой жа парою. Вясна прыйшла ранняя, цёплая — дружна зацвілі сады, у зеляніну прыбраліся дрэвы, а я выкраіў трохі часу, каб з'ездзіць, пагасціць у сястры.

lightfieldstudios.net

...З Мінска ад'язджаў рэйсавым аўтобусам. Чакаў яго на вакзале — сядзеў на лаўцы, глядзеў на людзей.

Сярод іх найбольш вылучаліся прыгожы мужчына гадоў мо 40—45-ці і хлопец — можа, 15-ці. Яны ўвесь час аб нечым жыва размаўлялі, трымаліся за рукі, хадзілі... Маладзейшы пры гэтым то неяк дзіўна, быццам нясмела, пазіраў пад ногі, то штосьці паказваў свабоднай рукой і ўвесь час усміхаўся — ну зусім як малы!..

Потым падышоў мой аўтобус, і гэтую «пару» я ўбачыў зноў — ужо сярод сваіх спадарожнікаў. Нават больш за тое, маё месца аказалася якраз за іхнімі спінамі, што давала магчымасць не толькі бачыць гэтых дваіх, але і чуць, аб чым яны так жыва гамоняць. Ва ўсякім разе, як толькі крануўся аўтобус, хлопец устаў — адсунуў шыбу ў акне...

— Прабачце, вам дзьмуць не будзе? — павярнуўшыся, спытаўся ў мяне старэйшы.

— Не, не хвалюйцеся, — запэўніў я.

Хлопец тым часам высунуў вонкі руку — жменяй стаў лавіць сустрэчнае і халаднаватае, відаць, паветра, бо аўтобус, апынуўшыся за горадам, пачаў набіраць усё большую хуткасць і адкрываць такія краявіды, што юнак не вытрымаў:

— Глянь, тата, каровы на лузе! І якія ж пярэстыя — як на падбор! — захоплена ўсклікнуў ён.

— Гэта, відаць, калгасны статак, — узяўся тлумачыць бацька. — І ўсе каровкі там адной пароды.

— А тут, глянь, — лес! — не сунімаўся хлопец. — Глянь, якія шышкі на дрэвах! А луг які, тата, глянь! Колькі кветак на ім!

— Шмат, Сяргейка... Заўсёды шмат: адны расцвітаюць, другія адцвітаюць, — спакойна расказваў бацька. — І такая вось прыгажосць пануе ў нас заўжды, аж да самай восені.

Пасажыры між тым ужо ёрзалі на месцах, ціха перагаворваліся, кідалі на гэтых дваіх досыць гнеўныя позіркі (нехта нават пальцам круціў каля скроні). Што, можа, і не дзіва: гучныя галасы і сапраўды маглі перашкаджаць — некаму чытаць, некаму — драмаць... А галоўнае — яны і не думалі сціхаць:

— Глянь, глянь, тата, гэта ж самалёт?! — ледзь не крычаў ад радасці юнак. — Глядзі, мы, наш аўтобус, здаецца, стаіць на месцы, а ён — ляціць... І што гэта? З яго падаюць нейкія парасонікі?..

— Гэта не парасонікі, — засмяяўся бацька, — гэта, сынок, парашуты. У іх, відаць, ідзе трэніроўка...

— Э-эй вы, экскурсаводы, ці нельга цішэй? — даляцела да нас аднекуль з задняй пляцоўкі. — Вы ж не ўдвух тут едзеце? І смешна каму сказаць: дарослыя людзі, адзін — амаль дзяцюк, а паводзіць сябе, як дзіця... Вы б дактарам яго паказалі, ці што?

— А мы ад іх едзем, — дрыготкім голасам стаў тлумачыць старэйшы з «экскурсаводаў». — Аперацыю зрабілі — на вочы. Сяргейка ў нас амаль сляпым нарадзіўся, а ўчора знялі павязку і вось — бачыце вынік...

Усе пасажыры на імгненне сціхлі, потым адзін (і, вядома ж, за ўсіх) досыць гучна сказаў:

— Дык вы гаварыце, гаварыце! Нікому вы не замінаеце. Я праўду кажу?

— Праўду, праўду, — заківалі галовамі пасажыры і потым, калі гэтыя двое забраліся на выхад, доўга абодвум глядзелі ўслед — і як жа шчыра зычылі здароўя!

Мікалай Багданаў,
Мёрскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж і, напэўна, яшчэ раз. Як пераканаліся нашы чытачы, «Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы» не хлусіць: гісторыі бываюць абсурдныя, амурныя, анекдатычныя, банальныя, абуральныя, дзівосныя, ідыёцкія, камічныя, кранальныя, павучальныя, скандальныя, трагікамічныя... Усяго — каля сотні слоў!.. А ўжо колькі праўдзівых — за час існавання рубрыкі...

Для тых, хто забыўся, нагадаем, што ў апошнія гады яна стала конкурсам на найлепшую... Вынікі яго падводзяцца ў пачатку года. Журы — і вялікае чытацкае, і малое рэдакцыйнае — працуюць. Так што пішыце. І, калі ласка, — з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі!

Неасабісты суб'ектыў

УРОКІ ГІСТОРЫІ

Для чаго ў нашым жыцці здараюцца настаўнікі

З усіх маіх школьных настаўнікаў — а мне сапраўды з імі вельмі пашанцавала — яго я запомніла асабліва. Ён прыехаў працаваць у нашу вясковую школу, калі мы былі ў пятым класе. «Новы гісторык» — шапталіся мы ў яго за спінай, з цікавасцю разглядаючы яго сутулаватую постаць. На настаўніка ён быў падобны мала — малады, да таго ж адзеты не па форме: у сіняй з белымі палоскамі «масцерцы», у стаптаных чаравіках. Заўсёды нейкі крыху разгублены, ён мог не заўважыць, што старшакласнікі прывязалі яму ножку крэсла да ножкі стала, што пяцікласнікі насыпалі яму на крэсла канфеці. Мая мама, якая была тады завучам, усяляк апекавалася над ім, нават часам брала з дому абед, «каб падмацаваўся». Ціхі, абсалютна неканфліктны і бяскрыўдны, ён у нашым вяскова-жорсткім асяроддзі прыжываўся даволі цяжка. Асабліва калі вясной пачаў хадзіць на мясцовыя курганы, нешта там вышукваючы, капацца на дзядзінцы касцёла, чапляцца да бабуль з роспытамі, як было раней. Вяскоўцы лічылі яго за дзівака і пасмейваліся з яго «даследчай работы». Мы ж, малыя, гледзячы на старэйшых, таксама ўсур'ёз гісторыка не ўспрымалі, толькі і прыдумлялі, якую яшчэ «падлянку» яму ўтварыць, каб урок сарваць.

А ён нашых выдумак і не заўважаў зусім. Расказваў пра старажытных фараонаў і грэчаскіх багоў так, нібыта з імі быў асабіста знаёмы. Мы мала што слухалі, больш гарэзнічалі... Не ведаю, што ён у нашым падлеткавым гармідары заўважыў, але аднойчы пасля ўрока паклікаў мяне і працягнуў нейкую дужа старую кніжку ў цёмна-зялёнай (з пераплётнай майстэрні) вокладцы: «На, пачытай. Думаю, табе будзе цікава». Не памятаю ўжо ні назвы той кнігі, ні яе аўтара. Але добра памятаю ўражанне, якое яна пакінула, і вобразы, якія яна намалявала ва ўяўленні. Кніга была пра старажытны Егіпет. І ў ёй усе гэтыя багі і фараоны, якія ніяк не запаміналіся па падручніку, раптам выстраіліся ў пэўным парадку, кожны займаў сваё месца, у кожнага былі свае справы. І чыталася ўсё, як чароўная казка — не адарвацца.

Апраз некалькі тыдняў мама, паехаўшы на нейкі настаўніцкі семінар у Дзяржынск, прынесла дадому кніжку Куна «Легенды і міфы старажытнай Грэцыі». «Век бы такую дарагую кніжку не купляла, але гісторык твой як прычапіўся ў кнігарні: купіце Лене, абавязкова купіце! А сам на кніжкі ўсю зарплату спусціў. Дзіва што ў адных штанах увесь час ходзіць...» Тая кніжка стала ў падлеткава-юнацкім узросце адной з самых маіх любімых. Яна, чытаная-перачытаная, нарадзіла і зацвердзіла перакананне на ўсё жыццё: гісторыя — рэч надзвычай цікавая. А яшчэ, калі вучылася на журфаку, дапамагла мне на «выдатна» здаць экзамен па антычнай літаратуры, не разгарнуўшы падручніка, — усе яе героі былі з тых легендаў і міфаў, якія даўно ведала ледзь не на памяць...

Праз год гісторык з нашай вёскі з'ехаў — казалі, падаўся ў сталіцу. Пасля выкладчыкі гэтага прадмета мяняліся ў нас літаральна кожны год, але чамусьці менавіта яго мы згадвалі, прычым успаміны былі добрыя, з лёгкай усмешкай... Аднойчы, убачыўшы яго імя і прозвішча ў «Чырвонай змене», мы, ужо старшакласнікі, гадалі: ён ці не ён? Цікавыя публікацыі аб беларускай мінуўшчыне ў рэспубліканскай газеце (для вучняў вясковай школы — недасягальная вышыня) неяк не вельмі стасаваліся з вобразам нашага гісторыка — дзівака ў старэнькіх чаравіках. Памятаю, тады падумалася: вось паступлю вучыцца ў Мінск — абавязкова высвятлю, ён ці не ён.

Высветлілася — ён. Прычым гэта ён мяне адшукаў, а не я яго. Пасля таго як з'явіліся ў «Звяздзе» мае першыя публікацыі, патэлефанаваў у рэдакцыю, каб удакладніць, ці вучылася я ў Валмянскай сярэдняй школе, ці працавала там завучам мая мама — ён нас таксама памятаў. Мы тады сустрэліся і вельмі доўга гаварылі. Пра што? Вядома, пра гісторыю! Яны з жонкай-журналісткай узяліся тады за надзвычай цікавую і новую па тым часе справу — пісаць пра славутыя імёны ў гісторыі Беларусі...

Не магу сказаць, што мы часта з ім бачыліся. Ён мог аб'явіцца праз два гады, а то і праз пяць. Нагоды былі розныя, але заўсёды цікавыя для мяне асабіста. Напрыклад, выйшла іхняя з жонкай новая кніжка пра жанчын, я пра яе напісала, публікацыю прачытаў адзін паэт, уразіўся і напісаў прыгожы верш, які быў апублікаваны ў «ЛіМе»... А праз нейкі час ён пазваніў мне ледзь не ноччу: «Паехалі пад Петрыкаў на раскопкі!» І гэта была адна з найцікавейшых прыгод у жыцці, калі пад яркім палескім сонцам, перабіраючы пясок і знаходзячы ў ім чарапкі, якім больш за тысячу гадоў, я многае зразумела пра гісторыю, пра Радзіму, пра саму сябе... Дзякуючы яму я заўсёды трапляла ў нейкі іншы свет — больш шчыры, больш сапраўдны. Нават завочна — у публікацыі аб людзях, што ўзялі на выхаванне «дзетдомаўскіх» дзяцей, якую рэдагавала, я раптам са здзіўленнем пазнавала яго з жонкай...

Мы не бачыліся і не чуліся мо гадоў дзесяць. Ведала ад агульных знаёмых, што ўсё ў іх добра, дзеці падрастаюць, кнігі выдаюцца. Як ведала і тое, што мой гісторык у любы момант можа паведаміць ці прапанаваць нешта надзвычай цікавае, што выцягне з прывычнай руціны, стане добрым успамінам... Але апошняя навіна была не такой. У сённяшнім нумары ў адной з публікацый павінна было згадвацца яго імя. А ўчора патэлефанавалі і сказалі, што публікацыі не будзе — герой памёр...

І я вырашыла, што абавязкова ўсё ж напішу пра яго. Бо ці стала б я той, кім стала, без аднаго са сваіх настаўнікаў, без свайго гісторыка, які ў пятым класе сказаў мне пра нешта вельмі сапраўднае і які час ад часу з'яўляўся ў маім жыцці, каб нагадаць, што гэтае сапраўднае нікуды не дзелася, што яно — назаўсёды...

Імя майго гісторыка — Мікола Багадзяж. Светлая яму памяць.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 29 марта 2022 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 300/D-678, площадью 960,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение
Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2 А-109
Информация о земельном участке: кадастровый номер 340100000001000921, площадь 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – Земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду
Начальная цена продажи с учетом НДС: 1 095 500,00 бел. руб.
Задаток (3 %) с учетом НДС: 32 865,00 бел. руб.
Дополнительные условия: заключены договоры аренды: РУП «Фармация» действует до 24.09.2024 г.; ОАО «Белинвест Банк» – до 01.10.2022 г.; ООО «Городская сеть терминалов» – до до 11.11.22 г.; ООО «Тимоша бел» – до 11.04.22 г.; ИП Мишанина М.Н. – до 31.12.2022 г.

Продавец: ОАО «Табаквинторг», г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Контактные телефоны: +375 29 334-04-60; +375 44 599-02-90.

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений заканчивается 28.03.2022 г. в 16.00.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

